Пралетары ўсіх краў, злучайцеся!

Кошт нумару—3 кап.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ БССР.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц — — 70 к.
» 3 » — — 2 р.
» 6 » — — 4 »
На 1 год — — 7 »
Зьмена адрасу—10 кап.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нонпарэлі пасьля тэксту — — — 50 кап.
За радок нонпарэлі сярод тэксту — — 1 руб.
За радок нонпарэлі перад тэкстам — — 1 р. 50 к.
Сьпешныя—на 50 проц. даражэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. падатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:
за 1 дакумэнт—60 кап., за кожны дадатковы—20 кап.
Беспрац. і чырвонаармейцы за 1 дакумэнт—15 кап., за кожны дадатковы—5 кап.
Публікацыі ЗАГС'у—5 руб.

Падпіска прымаецца ў Цэнтрагэнцтве Друку, ва ўсіх аддзяленьнях Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх паштова-тэлеграфных кантарах.
Абвесткі прымаюцца кантораю газэты: Менск, Савецкая, 63. Тэл. № 478
АДРАС РЭДАКЦЫІ—*Менск, Савецкая, 63. Тэл. № 478. Тэл. рэдактара—769.*

7-ы год выданьня. Штодзённая газэта № 98 (1693) Субота, 1-га мая 1926 г.

1-га мая-дзень усясьветнага пралетарскага адзінства.

Наша братэрскае прывітаньне і дапамога таварышам, стогнучым у турмах капіталу!

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Беларусі.

Ад імя прыгнечаных і зьняволеных мас рабочае клясы і сялянства Заходняй Беларусі—нашым братом у БССР у дзень 1-га мая пасылаем гарачае прывітаньне.

У дзень 1 мая, калі рабочыя і сяляне Заходняе Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі выйдуць на вуліцу, каб дэманстраваць свае сілы, калі гэты дзень міжнароднае пралетарскае згоды яны абернуць у дзень змаганьня з эксплёататарамі-памешчыкамі і капіталістамі,—погляды іх будуць накіраваны на Рэспубліку Саветаў, на вольны край улады працоўных.

У гэтым краі яны бачаць прыклад таго, да чаго трэба імкнуцца ў сваім рэвалюцыйным змаганьні, у ёй яны бачаць, як у жыцьці на практыцы рабочая кляса і сялянства пасьля перамогі над буржуазеяй і захвату ўлады ў свае рукі будуе сваю дзяржаву.

У БССР працоўныя Заходняе Беларусі бачаць прыклад правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, бачаць вольнае і творчае разьвіцьцё, вольнае і творчае жыцьцё ўсіх нацыянальнасьцяў.

Правільная палітыка савецкага ўраду БССР пад спрабаваным ленінскім кіраўніцтвам КПБ і яе Цэнтральнага К-ту і бясспрэчныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве краю: аднаўленьне прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, дапамога сялянству, пасьпяхоўнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня, вялізарнае разьвіцьцё беларускае культуры—натхняюць працоўныя масы Заходняе Беларусі і яшчэ мацней аб'яднаюць іх у магутную сілу для барацьбы за сваё вызваленьне.

Разьяднаныя часоваю штучнаю мяжою пагранічных слупоў, рабочыя і сяляне Заходняе Беларусі ня спыняюць весьці цяжкае, але непрымірымае змаганьне з польскаю буржуазеяй і разам з рабочаю клясаю і сялянствам усяе Польшчы няўхільна ідуць да перамогі над польскаю буржуазеяй, да перамогі, якая прынясе масам Заходняе Беларусі магчымасьць аб'яднацца з БССР.

У гэтым годзе 1 мая рабочая кляса і сялянства Заходняе Беларусі спаткаюць у нябывала цяжкіх абставінах. Эканамічны крызіс прывёў увесь край да разбурэньня і катастрофы. Дзесяткі тысяч галодных рабочых Заходняе Беларусі сядзяць бяз працы. За іх сьпінамі вялізарная армія дзяцей, жанок, матак—галодных, абадраных, змораных. Прамысловасьць замірае. Такія вялікія прамысловыя цэнтры, як Беласток, Горадня, Вільня—мёртвыя. Ня лепшае становішча і беларускага сялянства. Зямлі няма. Няма і заработку. Вялізарнымі крокамі ідзе ўперад рост вясковага беспрацоўя.

Голад і беднасьць ахапляе шырокія колы сялянства. Нацыянальны прыгнёт, бяспраўе ўлады—пануюць як і раней на «крэсах». А поруч з небясьпекаю росту рэвалюцыйных настрояў, з небясьпекаю росту «бальшавіцкае заразы»,—як ніколі па ўсёй Заходняй Беларусі сіберыць белы тэрор. Шматлікія арышты, „сэнсацыйныя" працэсы камуністаў, масавыя палітычныя аблавы ў вёсцы і рабочых кварталах гарадоў, перапоўненыя астрогі, разгон дэманстрацый беспрацоўных, правакацыі і цэлыя хмары шпёнаў,—вось штодзённыя зьявы з жыцьця Заходняе Беларусі.

Але ня ўдасца буржуазеі разьбіць рэвалюцыйны рух. У гэтым годзе ў дзень 1 мая камуністычная партыя адзначае як ва ўсёй Польшчы, так і ў Заходняй Беларусі значны і бясспрэчны ўздым рэвалюцыйнага руху, рост рэвалюцыйных настрояў. Мы ўступілі ў пэрыяд сур'ёзных і буйных падзей. Каліш, Стрый, Варшава, Вільня, Люблін, Львоў, Берасьце, Улацлаўск і інш.—вось непарыўны ланцуг крывавых дэманстрацый беспрацоўных. Па ўсім краі адбываюцца забастоўкі. З кожным днём абвастраюцца настроі сярод чыгуначнікаў, якія гатовы агульнаю забастоўкаю выступіць супроць скарачэньня 20000 чыгуначных рабочых. У вёсцы, якая не атрымала абяцанае зямлі, становішча таксама бязупынна абвастраецца. Адначасна з ростам рэвалюцыйных настрояў сярод мас, ростам уплыву нашае партыі, расьце небясьпека фашызму. Усе чорныя сілы рэакцыі рыхтуюцца да «адратаваньня» Польшчы «цьвёрдаю рукою дыктатара». Ідзе адкрытае аб'яднаньне фашысцкіх сіл. Усё больш выразна і пэўна праходзіць рыса, якая дзеліць край на два асноўных лягеры: фашызм і камунізм. Між гэтымі лягерамі і будзе адбывацца рашаючае змаганьне.

Першае мая 1926 г. будзе днём шырокіх масавых выступленьняў рабочых і сялян. З пачыну кампартыі Заходняе Беларусі ў Вільні, Беластоку, Берасьці і Горадні рыхтуюцца адзіныя рабочыя дэманстрацыі. У масах пралетарыяту расьце шырокае імкненьне да адзінства змаганьня. Пад кіраўніцтвам нашае партыі ў дзень 1 мая рыхтуюцца шырокія выступленьні і дэманстрацыі сялянства. Супольна з працоўнымі Польшчы мы будзем дэманстраваць свае сілы. Супольна з імі абернем дзень 1 мая ў дзень мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы і сялянства для змаганьня супроць фашызму, супроць буржуазеі, за рабоча-сялянскі ўрад.

Мы ведаем, што ў гэты дзень улада мабілізуе ўвесь свой апарат для змаганьня з працоўнымі. Мы ведаем, што вуліцы многіх гарадоў будуць паліты крывёю рабочых, што астрогі будуць папоўнены новымі сотнямі рабочых і сялян.

Але мы таксама ведаем, што ніякая сіла ня здольна ўжо затрымаць рост рэвалюцыйнага руху, што ніякая сіла ня можа перамагчы рост імкненьняў да аб'яднаньня ўсіх працоўных у адзіную, неразрыўную армію барацьбы з капіталам. Залпы з стрэльбаў, бізуны, атрады паліцыі і астрогі яшчэ больш шчыльна зьяднаюць масы. 1-га мая кроў замацуе рабочыя калёны дэманстрантаў у сьвяты рэвалюцыйны саюз для непрымірымага рэвалюцыйнага змаганьня за камунізм.

Пасылаем гарачае першамайскае прывітаньне ад імя Камуністычнае партыі Заходняе Беларусі і ўсіх працоўных, палючае камуністычнае прывітаньне кіраўніку і авангарду працоўных БССР—Камуністычнай партыі Беларусі.

Хай у дзень 1-га мая яшчэ мацней будзе наша сувязь, наша агульная ўпэўненасьць у перамозе!

Хай жыве 1 мая—дзень змаганьня з капіталам!

Хай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал!

Хай жыве Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка!

Хай жыве рэвалюцыя!

Цэнтральны Камітэт КПЗБ.

Вільня, 25-IV—1926 г.

1-га мая—дзень аб'яднаньня працоўных наўкола ленінскае партыі.

Першага мая ня звычайнае сьвята, якое азначае дзень працоўнага адпачынку, а баявое пралетарскае сьвята.

Яно зьяўляецца глыбокім сымбалем таго, што на зямлі адзінага сьвету, адзінага чалавецтва няма.

Ёсьць два сьветы—стары сьвет—у мінулым і сучасным—сьвет прыгнёту і эксплёатацыі, і новы сьвет—вызваленае працы.

Між гэтымі сьветамі ідзе жорсткая барацьба, барацьба на жыцьцё і сьмерць. Барацьба клясаў—двух асноўных клясаў—асілкаў сучаснае грамады: капіталістаў і пралетарыяў.

1 мая—дзень, калі пралетары аглядаюць свае сілы, калі падагульваюць вынікі этапаў барацьбы, якія ўжо пройдзены, і намячаюць пэрспэктывы новых боек. Асноўная мэта боек, галоўная пэрспэктыва: сілком скінуць стары сьвет.

Гэты лёзунг даў вялікі правадыр пралетарыяту—Карл Маркс. Гэта лёзунг яго „Камуністычнага маніфэсту".

Зараз, як ніколі раней, на гістарычнай, дасканальна праверанай жыцьцём практыцы пралетарыі маглі праканацца ў праваце гэтага лёзунгу.

На працягу апошніх дзесяці гадоў перад намі прайшлі: Кастрычнікавая рабочая рэвалюцыя ў Расеі, «сацыялістычны» ўрад (Шэйдэман—Эбэрт—Носке) у Нямеччыне, «рабочы» ўрад (Макдональда) у Англіі і шэраг буржуазейных сацыялістычных кааліцый.

«Сацыялістычныя», «рабочыя», каліцыйныя ўрады—што ад іх асталося?

— Хлусьня, мана, здрада і расчараваньне. Усе яны сталі сьмярдзючымі трупамі, якія атручваюць атмасфэру рабочае барацьбы за вызваленьне.

І толькі Кастрычнік 1917 году, дзіця Марксава лёзунгу аб нізрынуцьці, толькі Кастрычнік, адбіваючы злобныя хвалі старога сьвету, стаіць непарушна.

Да Кастрычніка, да сусьветнае бойні, якая была перад ім,—сацыялізм быў клічам пралетарскіх мас, сацыялістычны (II) Інтэрнацыянал быў правадыром і штабам пралетарскае барацьбы. Гэты штаб заваліўся і, як адрадзіўся, абярнуўся ў гняздо здраднікаў рабочых інтарэсаў, у гняздо лёкаяў старога сьвету.

Але ў магутных бойках вырас новы баявы штаб—**Камінтэрн** і яго асноўны атрад—**Усесаюзная Камуністычная Партыя.** І новы, правільней, абноўлены кліч яднае пралетарскія шэрагі—камунізм. Гэта ёсьць стары Марксаў лёзунг—нізрынуцьце сьвету капіталістаў—лёзунг, які аплявалі здраднікі.

Дзень першага мая—дзень зьяднаньня баявых пралетарскіх атрадаў наўкола Камінтэрну і сваіх камуністычных партый. Для рабочых Савецкага Саюзу—гэта дзень зьяднаньня наўкола УсеКП.

Мы больш шчасьлівы, як нашы заходнія браты. Там яшчэ сьвішчыць капіталістычны бізун, там пануе капіталістычны прыгнёт.

У нас суровыя ўмовы барацьбы з беднасьцю, барацьбы за гаспадарчае адраджэньне на новых падставах, за сацыялістычнае будаўніцтва. Мы перамаглі самае цяжкае на шляху да пралетарскага будаўніцтва: мы ажыцьцёвілі Марксаў лёзунг, скінулі стары сьвет і ў хвалях крыві адваявалі права на будаўніцтва новага сьвету. Камуністычная партыя была правадыром расейскага пралетарыяту ва ўсіх бойках і перамогах. Перад намі яшчэ стаяць вялікія і цяжкія задачы ў новым будаўніцтве, яшчэ будуць новыя бойкі. Мы яшчэ ня можам парабіць сярпы з мячоў. Але мы ўпэўнены ў перамозе, бо ў пралетарыяту Сав. Саюзу ёсьць дужы правадыр—Камуністычная партыя. У сваіх шэрагах яна зьяднала міліёны рабочых і сялян, наўкола яе, за ёю стаяць усе іншыя міліёны працоўных.

Рабочыя СССР перамаглі дзеля таго, што былі зьяднаны наўкола Камуністычнае партыі. Гэта зьяднанасьць прывядзе да новых перамог у будаўніцтве і бойках. Пра гэта добра ведаюць і нашы ворагі. Яны здаволена выюць, калі бачаць шчыліну між масамі і УсеКП, яны скавычуць зубамі, калі бачаць, як моцна зрастаюцца партыя і масы. Гэта зрастаньне—асноўны Ленінскі наказ.

Дзень Першага Мая—гэта дзень, калі дэманструецца перад працоўнымі масамі, як выканан гэты наказ.

Дзень Першага Мая—дзень зьяднаньня працоўных наўкола Ленінскае партыі.

І. Ф.

Ю. ЛАЗАРЭВІЧ.

ВЯСНА.

Братом Заходняй Беларусі.

Ідзе вясна чароўная,
Таемнай моцы поўная,
Вадой пераліваецца,
У логах адгукаецца,
Сьмяецца над зімой.
Узгоркі схамянуліся,
Ад сьнегу распрануліся
І парай задыміліся,
Як дываном пакрыліся
Зялёваю травой.
Загаманілі птушачкі
На хвойках і ялушачках,
І, ад каханьня шчырага,
На ворага нямілага
Ідзе самец у бой.
А з неба прамяністага
Нясецца песьня чыстая,
Зьвініць, пераліваецца,—
Там жаўранак купаецца
Высока над зямлёй.
Галінкі зашапталіся,
Трывожна заківаліся,—
І вось пучочкі трэснулі:
Лісткі з гнязьдзечка цеснага
Палезьлі чарадой.
Жыве ўсё, капошыцца,
Ў паветры шчасьце носіцца,
У сэрцы адбіваецца,
Надзеяй разьліваецца
І абдае вясной.
Браты мае нявольныя!
Вы для жыцьця супольнага
Даўно вясны чакаеце,
Аб лепшай долі дбаеце
Няспыннай барацьбой...
Прыдзе-ж вясна чырвоная,
І з песьняй многазвонную
Усе межы пасьціраюцца,—
Сьцяг—чырвань запылаецца
Над кулаю зямной!

Першага мая — сьвята працы.

У 1920 годзе пасьля масавага камуністычнага суботніку, наладжанага ў дзень 1-га мая, Ленін пісаў: **«Пасьля таго, як скінулі цароў абшарнікаў і капіталістаў, упяршыню толькі ачышчаецца поле для сапраўднага будаўніцтва камунізму, для вырацоўкі новай грамадзкай сувязі, новай дысцыпліны агульнае працы, новага ўсясьветна-гістарычнага ўкладу для ўсёй народнай, а затым і міжнароднай гаспадаркі.. Мы прыдзем да перамогі камуністычнае працы».**

Ленін лічыў неабходным падкрэсьліць у дзень 1-га мая факт вызваленай працы пры ўмовах савецкае ўлады для таго, каб сказаць, што гэтая работа вядзе да камуністычнае працы, якая галоўным чынам грунтуецца на сьвядомай дысцыпліне. Вось аб гэтай дысцыпліне і працы нам трэба ўспомніць, сьвяткуючы 1 мая.

У гэтым самым артыкуле Ленін далей кажа: **«Нас ня пужаюць ніякія перашкоды, якія павінны быць і будуць на першыя часы нашага будаўніцтва, бо справа перапрацоўкі ўсіх працоўных звычаяў і праваў—справа дзесяцігодзьдзяў».**

У выніку Кастрычнікавае рэвалюцыі мы стварылі моцную эканамічную падставу, моцны матар'яльны грунт для далейшае барацьбы за сацыялізм, для барацьбы з нашымі клясавымі ворагамі; мы павінны паказаць посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, бо кожны наш крок уперад ёсьць удар па капіталістычнаму сьвету. **Мы будуем сацыялізм.** Зараз гэта ўжо кожны разумее. Таму на нас ляжыць яшчэ большая адказнасьць за кожны крок нашага будаўніцтва. Наш вопыт будуць выкарыстоўваць міліёны пралетарыяў, па нашых дасягненьнях яны будуць судзіць, ці варта змагацца за сацыялізм, ці варта праліваць кроў, ці не. Гэта значыць, што мы нясём адказнасьць за сацыялістычную рэвалюцыю ня толькі ў нас, але ва ўсім сьвеце. Рабочая кляса — гаспадар працы, гаспадар прадпрыёмства—павінна пагаспадарску аднесьціся да сваёй працы. У нас ня досыць узьнята прадукцыйнасьць працы; у нас часта адсутнічае вытворчая дысцыпліна мы часта трацім дзяржаўныя гадзіны працы дарма, у нас значна распаўсюджаны гультайства, прагулы; у нас шмат чаго не на належным узвышшы і ў дзень **1-га мая аб гэтай камуністычнай дысцыпліне ў вытворчасьці аб якой гаварыў т. Ленін, нам трэба ўспомніць.**

Мы праводзім вялізную працу; мы будуем нашу сацыялістычную прамысловасьць; мы будуем новыя фабрыкі і заводы па апошняму слову тэхнікі; мы электрыфікуем і каапэруем вёску; каапэрацыя ўсіх відаў захоплівае вёску і яднае горад і вёску ў адзін саюз; гэта ня толькі палітычны саюз рабочае клясы з асноўнай сялянскай масай беднаты і серадняком; гэта саюз, накіраваны на ўзмацненьне лучнасьці гораду з вёскай, гэта эканамічны саюз.

Гэта значыць, што мы ўступілі ў вельмі адказны пэрыяд сапраўднага будаўніцтва сацыялізму, на якое патрабуецца шмат сіл, энэргіі сродкаў. Мы пяём у песьнях: «Даб'емся мы вызваленьня сваёю ўласнаю рукой...», а сацыялізм будаваць нам пэўна прыдзецца самім, бо пакуль што мы бачым, што нам на гэтую мэту ніхто сродкаў не дае. Нам гэтыя сродкі трэба вышукаць у сябе, у сваёй краіне, у сваёй прамысловасьці.

Ленін калісь пісаў, што будзе час, калі золатам мы, магчыма, будзем абсталёўваць адхожыя месцы, гэта будзе тады, калі золата ня будзе мець сваёй грашовай вартасьці, калі наогул ня будзе грошай. А зараз, пакуль золата зьяўляецца грашыма, якія нам неабходны для індустрыялізацыі краю, нам трэба праводзіць вялікую ашчаднасьць і эканомію, каб ніводная дзяржаўная капейка не прападала дарма. І ня толькі капейка — трэба, каб кожны працоўны ўсьвядоміў сабе, **што кожны прагультаены дзень—гэта страчаныя дзяржаўныя рублі, што ўздым прадукцыйнасьці працы нават на 1 проц.—гэта тысячы і міліёны рублёў у млын сацыялістычнага будаўніцтва.**

Вось у дзень першага мая—сьвята вызваленае працы—нам аб гэтай вытворчай дысцыпліне трэба ўспомніць. **Працоўныя масы СССР, якія на магіле свайго правадыра ўзялі на сябе абавязак выконваць усе яго заветы, у дзень першага мая гэты неапошні завет правадыра павінны памятаць.**

Л. К.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу, пад сьцягам Ленінізму завяршым перамогу пралетарскай рэвалюцыі.

Супроць наступу капіталу, супроць новых войн — створым адзіны фронт рабочых усіх краёў.

Першага мая і вялікдзень.

Сьвяткаваньне вялікадня пачалося ў сівыя часы паганшчыны, калі нашы продкі, падняволеныя сілам прыроды, найгорш адчувалі сябе зімою. Адгэтуль яны віталі вясну і яе прыход, як збаўленьне ад холаду і галоднай сьмерці, бо ўваскросшая прырода дасьць магчымасьць важыць новым жыцьцём і чалавеку.

Люмпэнпралетарыят Рыму і рымскія нявольнікі, якія жылі ў нечалавечых умовах эксплёатацыі і прыгону, ня бачылі, што шлях да лепшае долі ідзе праз барацьбу. Басяцкі пралетарыят, як лодыр і пасывісты, замест барацьбы ўваспрыяў ідэю мэсіі, больш таго —ён вераваньне паганскіх народаў аб уваскрасеньні багоў, якое ў тых азначала ўваскрашэньне прыроды, перанёс на вышоўшага на зямлю мэсію, які ўмірае, каб уваскроснуць і гэтым вызваліць нявольнікаў ад кайданоў нядолі (праўда, толькі на тым сьвеце). Хрысьціянская пасха разам з яе лягэндаю аб уваскрасеньні Хрыста, зьявілася як вынік пасывізму, адсутнасьці веры ў свае ўласныя сілы.

Іншае лягенды і ня мог выдумаць забіты нявольнік і лодыр-пралетарыят тых часоў.

Ідэя ўваскрашэньня і райскага жыцьця на тым сьвеце, дзе чалавеку самі будуць ляцець у рот райскія яблыкі, можа зьявіцца толькі сярод тых лодыраў, якія запаўнялі вуліцы Рыму.

У іншых умовах паўстала сьвяткаваньне пралетарскага, таксама веснавога сьвята—першага мая.

Ідэя гэтага сьвята зараджаецца не ў галаве люмпэнпралетарыяту; яна паўстала сярод барацьбітоў у працэсе барацьбы за лепшую долю, за лепшую будучыню.

Гэта ня ёсьць сьвята пасывізму, бязвольля. Першага мая—сьвята змаганьня, барацьбы.

Ні бог-Хрыстос, ні цар і ня гэрой вызваляць яго з няволі: ён даб'ецца лепшае долі сваёю ўласнаю рукой.

Пралетарыят ня пускае сьліны, думаючы аб райскіх яблыках; ён к чорту пасылае папоў, ксяндзоў, якія баяць яму аб райскім жыцьці на тым сьвеце —ён узяўся пабудаваць рай тут, на гэтай грэшнай зямлі.

І пакуль пралетарыят яшчэ не перамог капіталу —першага мая зьяўляецца сьвятам барацьбы; там, дзе ярмо капіталізму здолелі скінуць—першага мая становіцца сьвятам вольнае працы дзеля пабудовы вялікага гмаху камунізму.

А. Сянкевіч.

Першамайскае сьвята ў белапанскай Польшчы.

Польскі пралетарыят пачаў сьвяткаваць дзень першага мая, як сьвята міжнароднае рабочае салідарнасьці, аднычасна з пралетарыятам заходніх дзяржаў. Ужо ў 1890 годзе, калі міжнародны пралетарыят першы раз спраўляў сваё першамайскае сьвята, у Варшаве сьвяткавала каля 8 тысяч чалавек. А праз два гады, у 1892 годзе першамайскае сьвята ў Лодзі вылілася ў агульную забастоўку, якая трывала праз цэльны тыдзень і ахапіла каля 100000 рабочых, прычым дайшла да крывавых сутычак. Ад таго часу пралетарыят Польшчы штогодна сьвяткуе дзень першага мая.

Да ўтварэньня польскае рэспублікі ў дні першамайскіх сьвятаў пралівалі рабочую кроў, растрэльвалі дэманстрацыі польскага пралетарыяту чужыя войскі і паліцыя: нямецкія і расейскія. Пасьля ўтварэньня «незалежнае» Польшчы гэтым заняліся войскі і паліцыя самае Польшчы. Польская буржуазея асабліва зьверска праследуе рабочы рух і ў сваім зьверстве нават пакідае ззаду буржуазею заходніх краёў. Суседзячы на вялікім прасторы з рэспублікамі рабочых і сялян, суседзячы з рэвалюцыяй, польская буржуазея асабліва баіцца, каб прыклад з-за мяжы ня быў успрыняты польскімі рабочымі. Дзеля гэтага дзень 1 мая польская буржуазея сустракае з большаю трывогаю, чым буржуазея заходніх дзяржаў.

Гэтагодняе першамайскае сьвята працоўных асабліва страшна для польскае буржуазеі. Колькасьць беспрацоўных за год блізка падвоілася і дасягае 40 50 проц. усяе колькасьці рабочых. Прамысловасьць у страшэнным заняпадзе. Недарэчная палітыка польскага буржуазнага ўраду зачыняе выхад польскай прамысловасьці на замежныя рынкі. Аднычасна з гэтым гаспадарчая вайна з Нямеччынаю не прапушчае ў Польшчу танных нямецкіх тавараў шырокага карыстаньня з тых галінаў прамысловасьці, якія слаба разьвінуты ў Польшчы. Прывоз рэчаў збытку для задавальненьня прымхаў буржуазеі праз доўгі час трымаў баланс польскага замежнага гандлю пасыўным. З дзяржаўнага банку адплыў увесь запас замежных валютаў, якія служылі грунтам для новае польскае валюты «злотага». Злоты вось ужо 9 м-цаў як паніцца ніжэй свае залатое вартасьці. За апошнія тыдзень-паўтара злоты ізноў упаў: з 7 да 9 з лішкам за даляр. А гэта выклікае новы ўзрост дарагоўлі, новыя цяжкасьці для шырокіх працоўных масаў, зьмяншаючы фактычны заработак.

Усе гэтыя пэртурбацыі: заняпад прамысловасьці, павялічэньне беспрацоўя, узрост дарагоўлі—у гэтым годзе адчуваюцца працоўнымі масамі значна цяжэй, чым год таму назад. Дзеля гэтага і прычынаў да нездавольства ў рабочых масах больш, а ў зьвязку з гэтым і барацьба з рабочымі масамі аказваецца цяжэйшай і вастрэйшай.

Пэпээсаўскія лісіцы нюхам сваім адчуваюць пагрозу 1-га мая і пасьпяшыліся напярэдадні яго выйсьці з ураду кааліцыі з правымі партыямі. Як ні пажаданы дзеля пэпээсаўскіх правадыроў удзел ва ўрадзе, але ім ня хочацца браць на сябе адказнасьць за магчымае праліцьцё рабочае крыві ў дзень першамайскага сьвята пры аружным разгоне войскам і паліцыяй рабочых дэманстрацыяў.

Апрача больш высокае хвалі рабочага нездавольства, на дзень 1-га мая г. г. вызначаецца больш актыўны ўдзел сялянства падняволеных панскаю Польшчаю нацыянальнасьцяў. Здушэньне партызанскага руху з аднаго боку, а няўдача спробаў парлямачцкіх прадстаўнікоў дастаць хоць якія-небудзь уступкі дзеля здаваленьня неабходных патрэбаў нацменшасьцяў з другога боку—робяць тое, што зразуменьне патрэбы супольнага фронту з польскім пралетарыятам усё больш прасякае і ў вёску і ў парлямэнцкае прадстаўніцтва нацменшасьцяў. У гэтым узросьце рабоча-сялянскае салідарнасьці незалежна ад нацыянальнае прыналежнасьці—таксама значная розьніца і значны крок наперад гэтагодняга першамайскага сьвята ў параўнаньні з мінулымі гадамі.

М. С.

1-га мая на Беларусі да рэвалюцыі 1905 г.

(1895-1905 г.).

(Па матар'ялах Гістпарту пры ЦК КПБ).

У дакумантах мінулага і памяці ўдзельнікаў захаваліся толькі адрывачныя весткі аб тым, як зараджалася і выхоўвалася рэвалюцыйная думка звальненьня працоўнага ад векавога прыгнёту і гвалту.

Ужо з 1895 г. дзень першага мая пачынае прымаць палітычны адценак.

1-га мая ў 1896 г. каля 300 рабочых Менску прымаюць актыўны ўдзел у сьвяткаваньні.

Першамайскія лёзунгі цяпер маюць яшчэ большую яснасьць у сэнсе палітычных запатрабаваньняў, але яны яшчэ не заклікаюць да непасрэднай барацьбы з самадзяржаўем.

Незадоўга да 1-га мая 1898 г. у Менску па Захараўскай вул., цяпер Савецкай праходзіў І-ы зьезд РСДРП, які выпусьціў да насельніцтва спэцыяльную першамайскую адозву. У адозьве былі выкінуты лёзунгі:

8 гадзінны працоўны дзень, палітычная свабода стачак, слова, друку, сходаў і саюзаў. Свабода рэлігійных вызнаньняў, і раўнапраўе ўсіх нацыянальнасьцяў. Затым скліканьне ўстаноўчага збору.

Апрача гэтага, ЦК Бунда выдаў і распаўсюдзіў па Менску, Віцебску і іншых гарадох 2 брашуры: «Аб 1-га мая» і «Сон пад 1-е мая», 10.000 праклямацый.

Гэтыя праклямацыі ў сваёй аснове высоўвалі тыя-ж лёзунгі, што і І-ы зьезд РСДРП у першамайскай адозьве.

Сьвяткаваньне 1-га мая 1899 г. адзначылася выпускам спэцыяльнага нумару газэты «Арбэйтэр Штымэ» ў колькасьці—3.500 экз. і 12.000 праклямацый Бунда.

У гэтым-ж годзе арганізаваўся так званы «Рамесьленны Савет», які ўзяў на сябе кіраўніцтва існуючымі ў гэты час некаторымі прафсаюзамі, і таксама выпусьціў на 1-е мая сваю праклямацыю.

Далейшыя гады сьвяткаваньня дню 1-га мая да 1902 г. адзначаліся толькі такімі падзеямі, як: першамайскія забастоўкі, выказваньне лёзунгаў «Няхай жыве палітычная свабода» і «Далоў самадзяржаўе».

Ахвяр крывавых да гэтага часу ня было; першая крывавая ахвяра зьявілася ў 1902 г.—гэтай ахвярай быў малады Гірш Лекерт.

Пасьля бязьлітаснай расправы з Лекертам, царскі ўрад сіліцца спыніць першамайскае сьвяткаваньне 1903 г. арганізацыяй шэрагу яўрэйскіх пагромаў.

З гэтай прычыны ў Менску, Віцебску, Воршы і Магілёве адбыліся толькі тайныя сходы і адмаўленьне ў гэты дзень ад працы

Няпрыкметна і ціха таксама прайшло і 1-га мая 1904 г.

Першага мая 1905 г. як бы зьявілася прадвесьнікам тэй крывавай імглы, якая акутала рэвалюцыю 1905 г.

Сьвяткаваньне па Беларусі адзначылася ў Менску, Бабруйску, Воршы, Мазыры, Мсьціслаўлі, Нова-Барысаве і г. д.

1-га мая ў Менску выбухнулі шматлюдныя вулічныя дэманстрацыі і сходы.

Зборнымі пунктамі былі: пустыр на рагу б. Прэабражэнскай (Інтэрнацыянальнай цяпер) і Серпухоўскай (Валадарскага), каля бульвара па Савецкай вуліцы (раней Захараўскай), Багадзельнай (Камсамольскай) і Захараўскай (Савецкай).

Дэманстрацыя закончылася пабоішчам.

У выніку гэтага сьвята шмат рабочых адлежвалі ў гарадзкой бальніцы.

У данясеньні Менскай губэрскай жандармскай управы ў дэпартамант паліцыі было паказана, што сярод рабочых і служачых Маскоўска-Брэсцкага дэпо (цяпер МББ чыг.) у Менску вялася агітацыя «Іскраўцаў», якая і давяла да забастоўкі 1 мая.

МІХ. ГРАМЫКА.

РАМАНС ВЯСНОВЫ.

Ізноў вясна, і кветкі зноў!
Як майскі сьцяг бушуе кроў.
Ў прыродзе радасьць адраджэньня,
Жыцьця магутнае імкненьне,—
Усё гэта твой, вясна алькоў!

———

І як ні гляну, ні зірну,—
Я веру ў гэную ману.
У сонца цёплыя прамяньні,
Што асьвятлілі сутарэньні,—
У май я веру і вясну!

———

Гайкі й паркі—на парад!
Гараць струмені ў сто карат.
Прысады шэпчуцца ў спатканьні,
Хоць за спатканьнем разьвітаньне
Заўсёды сочыць акурат.

———

Што ні галінка, то раман,—
Прыроды радасны дурман.
І што ні сэрца то жаданьне,
А ў вочку кожным—запытаньне:
Дзе праўда сонца, дзе падман?

———

Ляціць ўсьцяж неба караван
З краін папаленых саван,
Ляціць да нас на гнездаваньне,
Каб тут зьмяніць сваё ўбраньне
І сьпевы кінуць на дзірван...

———

Але-ж за ўсё прывабней сьпеў,
У якім пабеда ёсьць і гнеў:
То гімны працы і паўстаньня,
Грамад магутных згуртаваньне
І сьцягаў безьлічны павеў!—

———

Хто вёсну ўчуе, той п'яны
Ад гэнай радаснай маны.
І асабістыя блуканьні
Пяройдуць хутка у зьліяньне,
У творчы сьпеў жывой вясны!

———

Бо зноў яна і кветкі зноў,—
Спраўджэньне ўсіх зімовых сноў,
Спраўджэньне сумнага чаканьня,
Ператворанага ў каханьне,
У чырвона-хвалісты алькоў!

Б. КАЗЛОЎ.

(Гомельская філія «Маладняка»).

ПЕРШАЕ МАЯ.

Першае мая. Сьцягі лунаюць.
Люду на плошчах мільёны.
Сёньня рабочыя сьвята спраўляюць
Расчырванеўшымся лёнам.

Сёньня сьвята ў кожным завулку
Лашчыцца песьняй маёвай,
Сёньня трыбуны разьветраць гулка
Леніна промені—словы.

Сьвята маёвае. Лес зелянее,
Нівы ў чароўным убраньні,
Горад наўкола чырваньню сее
Полымем дыхае зраньня.

Сьцягаў агністых полымя рэе,
Песьняў ваяцкіх пыланьне,
Сьвята палёў і сырых сутарэньняў,
Сьвята жыцьця і змаганьня.

А. ДЗЯРКАЧ.

ПЕРАКЛІЧКА.

Першы май—
сьвята працоўнага люду:
Ў гэты дзень
ня зьвініць сякера...
Пралетары рыхтуецца ўсюды
Да змаганьня
з асваленым зьверам!

Лес чырвоных штандараў—
ў небе!
Сьпевы громам грымяць—
на прасторы...
Думка марыць аусім не аб хлебе—
Аб усім, аб усім,
што на сушы, ў паветры, на моры!

У палацах дрыжыць багаты—
Чуе крывавыя кары!
Ў пагатове гарматы—
Нясупынна сачаць жандары.

Без канца ідуць грамады—
Ня пускаюць капытам, прыдачай...
Мала гэтага—газамі, куляй...
Гады!
Не адзін, не адна
над забітымі плача...

Ў гэты дзень
пераклікнуцца трэба:
«Гэй, нявольнікі! Сьмялей
да змаганьня!
Не чакайце збаўленьня
ні з пекла, ні з неба!
Сьвет стары руйнуйце самі
дашчэнту, дазваньня!

Чым можам—
гукнеце толькі,—
паможам:
Ня шкода—з плеч здымо галовы,
Але зможам! Зможам! Зможам!
Мы-на варце!
Чакаем!
Гатовы!

На мяжы.

Павольна, а то і са сьвістам загудзіць верхалінамі вецер; непакорлівы, сьцюдзёны з узгор'яў Заходняй Дзьвіны.

...Пад нагамі буланага сьнег хрушчыць-залівяецца: шэры, стоптаны сьнег...

Дарога санная... Дарога нудная... Дарога доўгая...

Спакойныя, вечна ціхія азёры, скаваныя сінім лёдам, зацярушаны сьнегам імглістым.

Вербалозьзе, бярозкі сагнуўшыся, абледзянелыя моўчкі хістаюцца...

Няпрыветна...
Пуста..
Звычайна...
Прасторы бязьмежныя.

Сьнег сьцелянаў... Дзе-ні дзе сьцяной цёмнаю лес стары, задумены, сумны пакажацца... Калыбаю чорнаю хмары павісьлі на грудзі зямлі асьнежанай...

Няпрыхільна...
Дакучліва...
Звычайна...

— Яшчэ вярста!..

Яшчэ адна вярста і мне здаецца што я ўбачу цёмнае прадоньне!?

Яшчэ вярста!

Яшчэ адна вярста і там за межамі—

Жудасна...
Цікава...
Крыўдна...

* * *

Мястэчка—
панурае, старое, клапатлівае..

Драўляныя, чуць згорбленыя хаты, якбы ўраслі ў зямлю...

Беднасьці!..
Імкненьне жыць!..

Дарогаю спаткаў, як талесы, сівога крамніка... Ён хадзіў па вуліцы, угля даўся ў неба, церабіў бародку і, відаць, маліўся.

Спакойны дзень... спакойнае жыцьцё,—так думаў крамнік, набожны Абрам... У хаце на стале, пад абрусам маца; у школе ён спакойна малітву прачытае; з суседам здолее гішэфт абгаварыць...

Пройдзе пэйсах, пройдзе сьвята, адчыніць крамку зноў Абрам... Зноў капейку да капейкі, так-гэтак, дзе там гандаль, эт... спакойнае жыцьцё!?.

Незадоўга гоман радасна-пераліўны, неўгамонны, звонкі прывабіў да сябе.

Пад'ехалі... Спыніліся... Весела... Кучаравыя, чуць загарэлыя, з яснымі агнямі вочкамі, у дванаццаць вушак сьпляценых лапцёх, дзяўчаткі і хлапцы цешыліся першым сонечным праменьнем.

— Вясна ідзе!.. Ідзе вясна жаданая,—закрасавалі вочкі дзетак хараством вясны! Дзеткі жыцьцёрадасныя, бедната сялянская, гульліва карагодзяць, забаўляюцца...

Разгаварыліся, зайшлі ў школку; школа беларуская.

Цікавяцца-пытаюцца,—а ці вялікі Менск? А як жывуць і вучацца там дзеткі? А ці многа кніжак, каб чытаць, у горадзе?..

І чытаюць вершы, з любасьцю чытаюць, з гордым хараством, мовай чыстай, роднай...

Дзеткі любяць вершы!...

Любяць вершы—
калі льлюцца плаўна, калі льлюцца думкамі радасьці, жыцьця...

А за вакном, як-бы на небасьхіле, віднеецца пахілая бярозка... Стаіць у нярухомасьці заклятай і быццам-бы бязьвольна ссутулілася, плача...

Замелька наша!..

Па дарожцы-сьцежцы зараз, вось цяпер, хацелася б пайсьці і страсануць каб залілася радасьцю, бадзёрасьцю юнацкай, пакрыўджаная сумная бярозка.

— Ды не, сягоньня ты ня пройдзеш, цябе ня пусьцяць, ты ня маеш права!..

Першы раз...

Першы раз, на дваццатай вясьне жыцьця вясёлага свайго пачуў, як моцна сэрца сьціснулася жалем...

— Цябе ня пусьцяць, ты ня маеш права,—а там пануе вораг і табе ня можна, каб пайсьці і сьцяць яго імкненьне да крыві.

Бедная зямліца!

Крывавым колерам ты пакрылася, Сьлязьмі нявольнікаў абмываешся! Паднявольныя стогны мужыцкія—водгульлем рвуцца ў сьвет!..

З гурбой, заўсёды бурнаю, з шустрай дзетварою пайшлі, як бы вясёлыя, на мяжу—граніцу.

Засьпявала песьню дзетвара сялянская, а ў мяне на сэрцы смутак зашурхаў...

* * *

Глянеш—роўніца раўніна, няма ні ўзгорку, ні купінкі—
мяжа...

Стаіць з арлом няволі шэры слуп, у некалькі радоў працягнен дрот калючы, у кроках тры ад нас паўпанак, шчупленькі жаўнер—
мяжа...

Зусім непадалёку вёска выглядае: стрэхі саламяныя, вось як і тут у нас, а за хатамі маленькімі палі бязьмежныя—
мяжа...

Змоўклі дзеткі, вочкі патупілі, крыўда спявіла,—
мяжа..

Ім цяпер ляцець бы з сілаю наперад, палётам думкі, імкненьнямі жыцьця!

Ахапіць сусьвет, захапіць узвышша і навае сваё стварыць, узьняць!

Мяжа...

Дзетвара сялянскай бедноты,—надзея нашай бацькаўшчыны вольнай!

Надзея—дзіўнае стварэньне! Яна ніколі не пакіне чалавека і ў цяжкія дні яго жыцьця.

Вось там, праз дзесяць крокаў, колькі сьветлых, колькі сонечных надзей у сэрцы змучанага брата.

Надзея слаўная, яна ніколі не пакіне, яны прымусіць палюбіць жыцьцё! З ёю падняволены, з ёй прыгнечаны ідзе на барацьбу і
пераможа!

* * *

І сьнег, як хмары, шэрым стаў... І вецер подыхам прадвесьні калыша сінюю чупрыну нахмураных лясоў.

Ідзе вясна.. Яна аздобіць барваваньнем жыцьцё любімай старонкі; загоіць раны сэрца, абудзіць радасьць, навевам шчасьця спаўе...

І радасны, як дзень вясны, я бачу думкамі сонечны наш край.

Стазвонным пералівам, гордым неўгамонным лілася песьня Сонца!

Вясна ідзе! Вясна крыніцаю аздобіць край! Ідзе, прыдзе, верым:

Радасьць...
Сусьвет...
Сонца...

Андрэй Александровіч.

ЯЗЭП ПУШЧА.

КАХАНЬНЕ.

I.

Ня бльвёг у даліне пасох
і ня вецер сумуе ў лясох.

То дзяўчына дубровай ідзе,
што радасны ўтраціла дзень.

Ня лісты зажурыліся ў сінь
і ня смутак асеньві асін.

То прадоньне вачэй агнявых,
што хлапец малады узгнявіў.

Ня туман ды расу пагубляў
і ня срэбра зіяе між плям.

То сьлязіны цьвітуць на пяску,
што яна пагубляла ў вясну.

Не каліна ад соку гарыць
і ня зорка ўзышла з-за гары.

Гэта вуснаў жывы агняцьвет,—
у іх запале румяніцца сьвет.

Не трава зашумела ў лугох
і ня лён у лагчыне палёг.

Гэта косы павісьлі на стан,
роспачы час як настаў.

Ня бльвёг у даліне пасох
і ня ветры сумуюць ў лясох.

То дзяўчына дубровай ідзе,
што радасны ўтраціла дзень.

II.

Ня шуміце, вятры, увечар з клёнамі,—
ой, дуброва мая, дуброва зялёная!

Маю жаль на цябе сьлязімі скраплены,—
рассыпайся, сьляза, па лісьці кроплямі.

Я ў прыгоршчы зьбяру і роспач спырскаю,—
расьсявайся туга ў самоце пырскамі.

Нешчасьліва мая дарож дзявочая,—
абступілі мяне скрозь сьцежкі воўчыя.

Ды пайду я, пайду ў даль з паклонамі,—
ой, дуброва мая, дуброва зялёная!

Не паіла ліста ты сытна сокамі,
не ўрадзіла яго ты мне шырокага.

Ня прыкрыла сьлядоў свайго я мілага,—
замялі-ж іх вятры пяскамі сівымі.

Ён дастаўся другой у ноч купальскую,—
не галубіць мяне ўжо болей ласкаю.

Ня прыждала сватоў, гульні вясельнае,—
я адна сірата у ноч асеньнюю.

Ня шуміце, вятры, увечар з клёнамі,—
ой, дуброва мая, дуброва зялёная!

III.

Пасьцілайся, смутак, пасьцілайся, каляровы,—
ходзіць-блудзіць хлопец, ходзіць-блудзіць каля рову.

Спахмурнелі вочы, спахмурнелі чорны бровы,—
падышоў як толькі, падышоў як да дубровы.

—Ня сумуйце, сосны, ня сумуйце сіратліва,—
расьцьвіце ў весну, расьцьвіце наноў каліва.

Я спаткаў учора, я спаткаў палёў красуню,—
ёй аддаў напевы, ёй аддаў усю красу я.

Васілёк блакітны, васілёк мне падарылі
лебядзіны рукі, лебядзіны белы крыльлі.

Захаваў за памяць, захаваў глыбока ў сэрца,—
ён сягоньня вяне, ён сягоньня з жалю рвецца.

Не астылі мары, не астылі успаміны
аб былой дзяўчыне, аб былой галубцы мілай.

Вартавалі вусны, вартавалі ў млявым полі,—
часта мы блудзілі, часта мы ўсю ноч ня спалі.

Я галубіў шчыра, я галубіў кары вочы,—
не забыць ніколі, не забыць сьлязін дзявочых.

Мне здаецца, бачу, мне здаецца яны ў шуме,—
іх штодзень у думках, іх штодзень ў душы нашу я.

Пакахаў у весну, пакахаў пад шолат веццяў,—
раскахаю ў восень, раскахаю ў надасьвецьце.

Стану вольным птахам, стану вольны сваім духам,—
што было—ня будзе, што было—названь патухне.

Не пайду пад клёны, не пайду зрываць лісточкі,—
ня прыкрыю болей, ня прыкрыю я сьлядочкі.

Ня схмурнеюць вочы, ня схмурнеюць чорны бровы,—
падыйду як толькі, падыйду як да дубровы.

СХОД, ПРЫСЬВЕЧАНЫ ДНЮ ДРУКУ,

АДБУДЗЕЦЦА

5-га мая а 7 гадзіне вечара

ў клюбе КАРЛА МАРКСА.

Пасьля заслуханьня дакладу аб дню друку будзе наладжан

ШЫРОКІ АБМЕН ДУМАК

рабкораў, чытачоў і ўсіх жадаючых—аб менскіх газэтах і часопісах.

Пасьля абмену думак выступленьне «Маладняка» і «Зьвеньеўцаў» і канцэртнае аддзяленьне.

Запрашаюцца ўсе рабкоры, насьценкоры, рэдакцыі і чытачы ўсіх газэт і часопісаў.

Білеты па прадпрыёмствах.

Р. МУРАШКА.

Пасьвянціў.

(Абразок з вялікоднага).

Праз маленькае аконца ў хаціну Лявона глядзела цёмна-бялявая ночка.

Яна сёньня такая прыгожая, такая прыгожая, бы знарок падрыхтавалася страчаць «хрыстос уваскрос». А зоркі сінявата халодным сьвятлом міргаюць ёй з далячэзнае вышыні, усьміхаючыся не пачалавечаму, з таемнай загадкавасьцю.

— Боооом!—дрыготна-басістае ўскалыхнула начную сьціш.

— Ціў-ціў-ціў!..

Нездаволена закаташыліся, запырхалі пад стрэхам вераб'і, бы шлючы гэтую нездаволенасьць звану, што ўзбудзіў іх.

— Ціў-ціліў-ціў-ціліў — нашто нас узбудзіў?

Выццам пыталіся так яны сваім сонным ціліўканьнем.

Уплыў звон і ў хату Лявона, пасабіўшы засланіць яго жонцы печ і спыніўшы на сёньня марудную працу з варывам. Скончыўшы працу каля печы, Параска загарнула ў белую хустачку чырвоныя яечкі і паклала іх на стол разам з жоўтаю пузатаю перапечкаю.

Боооом! Бооом! Бооом!

Прайшло паважна-урачыстым па хаце і стрэлася з дужым Лявонавым хр-р-р--р ха-а-а-а.

— Лявон!

— Га! . Што?

— Ну, і як ты ляж сабе на наляжыш з гэтае ляжкі. Ніколі ня можа выспацца.

— З крупіла ўжо сваю малатарню. Я думаў, што, ня ў хаце ў нас казана, пажар дзе. Прылямантавала на ўсю хату, як звар'яцелая.

— Дакуль-жа ты спаць будзеш? Пара ўжо яйцы везьці пасьвянцаць. Злазь, а я змарылася за вечар—лягу адпачнуць трохі.

Апошнія словы Параскі прабудзілі нешта крыху злоснае ў сярэдзіне Лявона і сапхнулі яго з печы.

— Пасьвянцаць... Так смачна заснуў—а а ах!

Салодка пазяхаючы, выйшаў на двор.

Надакучлівы звон закруціўся вакол яго рахманым сабакам, але, прабраўшыся глыбока ў сярэдзіну, толькі пашырыў, павялічыў тое маленькае злоснае, што прагнала яго з печы пры словах жонкі.

І вось гэтае злоснае пачынае казаць яму:

— Яшчэ рана. Трэ' было трохі паспаць і потым паехаў-бы. Яшчэ—прысьпееш—ідзі ў хату.

Маленькае злоснае ўпадабала Лявону, і ён трохі супакоіўся. Ці варта было злавацца, ну, хоць-бы і на жонку? Яна цэлы дзень працавала, затамілася.

— А тыж працаваў? Не натаміўся?—скрабло нешта ў глыбіні.

— Ну, і яна працавала, і я працаваў,—здалося Лявону, крыкнуў ён.—Дык што ж з таго?

— А тое, што яна сьпіць, а табе вось трэба ехаць халадэчаю гэтаю.

Зноў узбурыўся Лявон. Але каб трохі набыць нядаўны спакой, зірнуў угару проста ва халодна-лядзяныя зоркі і ўвесь скалануўся ад іх холаду. Хата з сваім цяплом пацягла прынадна да сябе. Пазяхнуў яшчэ раз шырока разьзявіўшы рот, і вярнуўся ў хату, ціханька зачыніўшы дзьверы.

Параска ўжо спала, тоненька-тоненька прысьвістываючы ў нос.

Прыемная цяплынь апранула Лявона, падвяла да стала і пяшчотна схіліла яго галаву на рукі. І праз млявыя дрымоты бы нехта зноў загаманіў над самым вухам Лявона:

— Чымся ноч праезьдзіць на прадранічным халадзе, дык лепш паспаць у цяпле, а яйцы... Можна разгавецца і непасьвянцонымі. Сон—гэта вялікая рэч... А тут едзь за сем вёрст—і хто такі парадак устанавіў, каб яму галава на карку не стаяла... А заўтра пасьля адпачынку вельмі добра будзе пасьведаць—спагнаць за пост...

У салодкай здаволенасьці ад голасу гэтага «нехта» Лявон перастаў больш чуць, вочы зачыніліся самі сабою і ружовы туман схаваў ад яго чырвоныя яйцы, стол, усю хату.

Смачна сьпіць Лявон за сталом, нібы на мяккіх вялізных пярынах. Ня чуе ён, як раптам пераскокамі пасьпешнымі адзін перад другім забухалі, забрахалі, загаласілі званы:

— Боб-бо-оом-цілім бо-ом-цілім-боом-бом-бо-оо-м цілім-цілім-цілім-цілім-бо-о-ом!

Кот узьлез на стол і пацяг невялічкую булачку, але тая ўпала на падлогу і сваім стукам узбудзіла Лявона.

— Цілім бом-цілім-бом!..

— Эх, ужо і яйцы пасьвянцаюць.. Ну, цы ладна.

Парашыўшы, мабыць, узяў шпарка хустачку з яечкамі і прыціснуў жыватом да стала. Ціханька трэснулі яны. Паціснуўшы яшчэ трохі ў руках іх, паклаў на стол і гукнуў:

— Жонка, а, жонка! Уставай!

Параска прадрала заспаныя вочы.

— Хрыстос уваскрос!—і Лявон пацалаваўся на крыж з Параскаю.

— Вось і я ўжо прыехаў—пасьвянціў яйцы. Бачыш, відната якая на двары. Зараз і сонейка будзе йграць.

І з гэтым Лявон пашоў да мыцельніку мыцца.

— Але ж і я моцна спала, ня чула нават, як ты ў хату ўвайшоў.

— Дык даставай хіба, Параска, ежу ці што, ды будзем разгаўляцца,—прычэсваючы драўляным грабянцом галаву, сказаў Лявон.

— Вось, беднецькія, як патаўкліся,—бяручы яйцы праказала Параска.

— Не патаўкліся-б, мусіць, гэтак, каб і ў царкву да гораду звазіў іх,—падумаў Лявон з усьмешкай, пачынаючы маліцца.

Голасна казаў словы малітвы, а ў ваччу пабітыя яйцы, ды ў галаве думка:

— Ну, і пасьвянціў.

— А ці не ўсяроўна—пакрапіў-бы іх поп вадою ці не?—казала нешта ў сярэдзіне.

Ужо ў застольле садзючыся ўспамянуў зноў, як сказаў жонцы, што пасьвянціў яйцы, як яна пасьля пашкадавала беднецькіх, што яны патаўкліся, і па вуснах яго заскакала хітравата гульлівая ўсьмешка.

Пасьля падпісаньня савецка-нямецкага ўгавору.

ЧЭМБЭРЛЕН ВЫКРУЧВАЕЦЦА АД ПРОСТЫХ АДКАЗАЎ.

ЛЁНДАН, 28-IV. Дэпутат рабочае партыі Вэствуд запытаў у палаце вобшчын: ці далучаецца ангельскі ўрад у якой-небудзь меры да думкі Бэнеша, які лічыць, што дзяржавы, якія падпісалі Лёкарнскі ўгавор, маюць права патрабаваць, каб нямецкі ўрад ня браў на сябе ніякіх абавязацельстваў нэйтралітэту ў дачыненьні да СССР?

Чэмбэрлен адказаў, што ангельскі ўрад выступае зусім незалежна, самастойна і асобна ад якога-небудзь іншага ўраду, калі рабіў Нямеччыне заяўленьні наконт перамоў аб угаворы з СССР.

Вэствуд далей запытаў, ці можа Чэмбэрлен сказаць, якія прычыны прымусілі ангельскі ўрад не далучацца да думкі Бэнеша. Чэмбэрлен адказаў адмоўна, дадаўшы, што ён ня меў яшчэ магчымасьці, як належыць, разглядзець нямецка-савецкі ўгавор.

АНГЕЛЬСКАЯ ПРЭСА АБ УГАВОРЫ.

ЛЁНДАН, 28-IV. Усе ангельскія газэты падкрэсьліваюць, што трэба «ўважліва разглядзець» нямецка-савецкі ўгавор.

«Таймс» піша, што ўгавор зьмяніў становішча на Усходзе Эўропы, у сувязку з чым заходнія дзяржавы павінны адпаведна зьмяніць свой погляд на Лёкарно.

Водлуг думкі ліберальнае газэты „Манчэстэр Гардыян“, нямецкі ўрад падпісаўшы ўгавор, не зрабіў нічога, што ганьбіла-б дзяржаву, якая знаходзіцца напярэдадні ўваходу ў Лігу Нацый.

Ліберальная «Вэстмінстэр Газэт» думае, што ўтварэньне згоды з СССР павялічыць перашкоды для ўваходу Нямеччыны ў Лігу Нацый на сэсіі Лігі ў верасьні.

«ТАН» АБУРАЕЦЦА.

ПАРЫЖ, 28-IV. Абмяркоўваючы зьмест нямецка-савецкага ўгавору, «Тан» заяўляе, што ўгавор накіраван проці Лёкарно і Лігі Нацый. Як на доказ сваіх слоў, газэта зазначае на нядаўнюю гутарку Чычэрына з прадстаўнікамі прэсы аб Лізе Нацый. Сучасны ўгавор наконт нэйтралітэту,—піша газэта,—цяжка прыстасаваць да палітыкі Лігі Нацый.

ПОЛЬСКАЯ БУРЖУАЗЕЯ І ПАМЕШЧЫКІ НЕЗДАВОЛЕНЫ ЎГАВОРАМ.

ВАРШАВА, 28-IV. Гэта «Новы Кур'ер Польскі» (афіцыёз міністэрства замежных спраў) наконт нямецка-савецкага ўгавору піша: «Лёкарно ставіла сабе мэтаю ўтварыць аснову для супрацоўніцтва дзяржаў у інтарэсах усеагульнага міру. Калі СССР і Нямеччына лічаць гэтую мэту «процісавецкім жалам Лёкарно», жадаючы яе зьнішчыць, дык мірныя імкненьні іх набываюць небясьпечнасьць. Можна думаць, што ў новым угаворы між Нямеччынаю і СССР захавана жала, небясьпечнае для міру.

Водлуг думкі рэакцыйнае газэты „Газэта Поранна Варшаўска“, угавор не зьяўляецца нечаканым, не дадае нічога новага да міжнароднае палітыкі і не накіраван проці каго-небудзь, бо савецкая дыплёматыя прывычаілася шукаць дапамогу ў Бэрліне. Газэта думае, што падобна ранейшаму ўгавору з Нямеччынаю, угавор аб нэйтралітэце таксама ня дасьць карысьці савецкаму ўраду. Газэта лічыць, што савецкі ўрад ня можа марыць пра магчымасьць забясьпечыць беззапаснасьць СССР з боку Захаду праз угавор з Нямеччынаю. «Штрэзэман,—заяўляе газэта,—пужае Брыяна і Чэмбэрлена небясьпекаю краху Лёкарно, а Чычэрына зданьню процісавецкага блёку. Зьвязваючы такім парадкам сваіх партнёраў, Штрэзэман павідае сабе волю дзеяньня». Нарэшце газэта дае запытаньне: „Дзе падзелася гучна-рэклямаваная незалежнасьць савецкае замежнае палітыкі?“

Газэта сялянскае дэмакратычнае партыі «Рэч Посполіта» знаходзіць, што ўгавор дасьць карысьць СССР, які ажыцьцёвіў сваю першапачатковую мэту—перашкодзіць Нямеччыне ўвайсьці ў Лігу Нацый, і атрымаў, апроч таго, ад Нямеччыны крэдыт у 300 мільёнаў марак. «Нямеччына,—піша газэта,—як відаць, чакае вельмі значных вынікаў ад угавору з СССР, калі яна згадзілася ўтварыць яго за такую вялікую цану. Польшча павінна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на магчымыя вынікі ўгавору».

БЭНЕШ ЧАКАЕ, ШТО СКАЖУЦЬ ІНШЫЯ.

ПРАГА, 28-IV. Усе праскія газэты прысьвячаюць артыкулы нямецка-савецкаму ўгавору аб нэйтралітэце. Афіцыёз міністэрства замежных спраў «Прагэр Прэсэ» піша: «Агалошаны тэкст угавору не падцьвярджае тае небясьпекі, аб якой пісалі і казалі перад падпісаньнем угавору. Уважлівы разгляд угавору пакажа, у якой меры ў ім можна бачыць супярэчаньні артыкулам 16-му і 17-му статуту Лігі Нацый. Чэхаславакія будзе чакаць, што скажуць іншыя дзяржавы, бо яна сама ў гэтым пытаньні ня ставіць сабе спэцыяльных мэтаў.

УГАВОР—УДАР МОЛАТА НА ПРЭСТЫЖУ ЛІГІ НАЦЫЙ.

Водгукі швэдзкае прэсы.

СТОКГОЛЬМ, 28-IV. Усе швэдзкія газэты абгаварваюць нямецка-савецкі ўгавор аб нэйтралітэце.

Кансэрвацыйная «Ніэ-Дэгліт-Альханд» раўняе ўгавор з ударам молата па арт. 16-м статуту Лігі Нацый.

Аўтарытэтная права-ліберальная «Гетэборг-Хандэльс Тыднінг» заяўляе, што Чычэрын пазбавіў Лігу Нацый будучыны. Газэта думае, што з гэтага часу ўсякая спроба Лігі Нацый ужыць проці СССР ваенныя або эканамічныя рэпрэсіі ня будзе мець посьпеху.

„Сацыял-Дэмакратэн“, якая раней бачыла ў угаворы пагрозу спакою і Лізе Нацый, зьмяніла свой погляд. У перадавым артыкуле пад загалоўкам «Мост Лізе Нацый» газэта заяўляе, што нямецка-савецкі ўгавор ня толькі не перашкаджае ідэям Лігі Нацый і Лёкарно, а наадварот, можа зьявіцца мостам праз прорву, якая зараз адмяжоўвае Лігу Нацый ад СССР. З гэтае прычыны, водлуг думкі газэты, угавор пашырыць асновы, на якіх павінен быць пабудаваны мір у Эўропе.

Камуністычная газэта падкрэсьлівае, што нямецка савецкі ўгавор зьяўляецца новым доказам мірнае палітыкі, якое ўвесь час прытрымліваецца СССР.

ПОГЛЯД У ФІНЛЯНДЫІ НА ГАРАНТЫЙНЫ ЎГАВОР СССР З ПРЫБАЛТЫЦКІМІ КРАЯМІ.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 28-IV. Друк Фінляндыі аддае шмат увагі пытаньню аб гарантыйным угаворы між СССР і балтыцкімі дзяржавамі.

Афіцыёз „Уусі Суомі“ лічыць прапанаваны СССР мэтад вырашэньня спрэчных пытаньняў шляхам узаемнага пагоджаньня нямэтазгодным і патрабуе абавязковага арбітражу.

Газэты прагрэсыўнае партыі падкрэсьліваюць важнасьць прапановы СССР. Апроч таго, яны нездаволены тонам афіцыёзу «Уусі Суомі», у якім, водлуг іх думкі, адчуваецца адмоўнае дачыненьне да прапановы савецкага ўраду. Орган прагрэсыўнае партыі «Гансілгіт Саномат» раіць ураду Фінляндыі глядзець на гарантыйны ўгавор з СССР з увагаю і прыхільнасьцю. «Фінскі Сацыял-дэмакрат» лічыць патрэбным пагодзіць прапанову СССР са статутам Лігі Нацый; газэта прадбачыць на шляху да ўтварэньня ўгавору некаторыя перашкоды, з прычыны таго што СССР не прызнае Лігі Нацый.

Разгул рэакцыі ў Баўгарыі.

Свавольствы фашыстаў.

ВЕНА. Гэтымі днямі група ўзброеных баўгарскіх фашыстаў затрымала поезд, які ішоў з Сафіі ў Відын. Фашысты з рэвальвэрамі ў руках раптоўна ўварваліся ў купэ, дзе знаходзіліся правадыры сялянскага саюзу Томаў і Барысаў, забралі іх з сабою ў горы і праз некаторы час вызвалілі. Гэта было зроблена з мэтаю сарваць сход сялянскага саюзу ў Відыне, на якім павінны былі выступіць Томаў і Барысаў. У пачатку красавіка прапаў сябра вышэйшае рады сялянскага с[аюзу] Пекараў. Думаюць, што і яго завялі куды-небудзь фашысты, каб зрабіць нажым на сялянскі саюз, які разгортвае на месцох вялікую працу.

Растрэл рабочых-камуністаў.

ВЕНА. Надоечы ў Софіі скончыўся суд над групаю палітычных эмігрантаў-камуністаў і сяброў сялянскае партыі, якія належаць да так званага заграничнага прадстаўніцтва адзінага фронту ў Югаславіі. 2 рабочых засуджаны да кары сьмерцю. Іх абвінавацілі ў замаху на ўзрыў афіцэрскага клюбу ў Софіі.

Падзеі ў Кітаі.

Сялянскае паўстанне ў Шандуні.

ПЕКІН, 28 IV. Газэта «Чэн Бао» паведамляе, што **на поўдні Шандуньскае правінцыі разгортваецца сур'ёзны сялянскі рух, які ставіць сабе мэтай сацыяльную рэвалюцыю.** Газэта заяўляе, што паўстанцы, якія называюць сябе «чырвонымі стралкамі», маюць значныя сродкі і забяспечаны харчамі, в прычыны чаго **прыдушыць рух будзе ня лёгка.**

Нягодныя спробы рэакцыі раскалоць сілы рэвалюцыйнага Кантону.

Дэкларацыя Гаміндану.

КАНТОН, 28 IV. Палітбюро партыі Гаміндан агаласіла дэкларацыю, у якой адзначае, што за апошні год рэвалюцыйная ўлада Кантону ўзмацнілася. Спробы імперыялістаў разграміць рэвалюцыйны рух на поўдні Кітаю пры дапамозе ваеннае сілы рэакцыйных кітайскіх мілітарыстаў, а таксама праз эканамічны нажым і блёкаду, зьмяніліся спробамі падарваць адзінства рэвалюцыйных сіл ў іх асяродку. Фабрыкуюцца розныя чуткі аб «чырвонай небясьпецы», «інтрыгах» камуністаў у радох Гаміндану і г. д.—усё гэта выдумваецца, каб раскалоць партыю Гаміндан і зьнішчыць кантонскі ўрад.

Партыя паранейшаму будзе прытрымлівацца палітыкі Сун-Ят Сэна у рабочым і сялянскім пытаньнях, будзе падтрымліваць эканамічныя патрабаваньні пралетарыяту і сялянства і будзе абараняць іх арганізацыі і грамадзянскія правы. Партыя будзе ўзмацняць нацыянальна-рэвалюцыйную армію, каб абараніць рэвалюцыйныя заваёвы ад чужаземных і ўнутраных ворагаў.

Дэкларацыя ў канцы заклікае масы падтрымліваць Гаміндан і рэвалюцыйны ўрад і ня верыць выдуманым чуткам.

ДОКТАР ІЕН СКЛАДАЕ ЦЭНТРАЛЬНЫ ЎРАД.

ПЕКІН, 28 IV. Начальнік гарнізону Пекіна генэрал Ван Гуан-Чын (прыхільнік У-Пэй Фу) прапанаваў доктару Іен (быўш. прэм'ер у 1922 і 1924 г. г.) скласьці часовы ўрад. Доктар Іен згадзіўся абгаварыць гэтае пытаньне, у зьвязку з чым думаюць, што ўрад будзе складзены ў бліжкім часе. Гэты крок У-Пэй Фу сьведчыць, што між ім і Чжан-Цзо-Лінам існуюць розногалосьсі.

НАСТУП МУКДЭНЦАЎ НА НАРОДНУЮ АРМІЮ ПАД НАНКОЎ.

ПЕКІН, 28 IV. Водлуг апошніх паведамленьняў, у Нанкоу (месца разьмяшчэньня народнае арміі) ідуць вялізія артылерыскія бойкі. Мукдэнскае войска, нібыта, ужо зруйнавала чыгуначныя майстэрні ў Нанкоу. Ходзяць чуткі, што ў ваколіцах Нанкоу згуртаваны вялікія сілы Чжан-Цзо-Ліна. Войска У-Пэй Фу яшчэ не бярэ ўдзелу ў ваенных апэрацыях.

ПРЫМУСОВАЯ ПАЗЫКА ДЛЯ ВЫПЛАТЫ ПЭНСІЙ ВОЙСКУ.

ПЕКІН, 28 IV. Вайсковая ўлада Пекіну загадала начальніку пекінскае вайсковае паліцыі дамагчыся што б там ні было ад мясцовых банкіраў пазыкі ў 3 мільёны руб. для выплаты войску, якое раскватэравана вакол сталіцы.

ВОБЫСКІ Ў УНІВЭРСЫТЭТАХ.

ПЕКІН, 28 IV. Пекінская паліцыя робіць вобыскі ў універсытэтах і вышэйшых вучэбных установах, шукаючы бальшавіцкае літаратуры і дакумантаў. Шмат прафэсароў і выкладчыкаў уцякло з гораду.

ЗАКЛІК СТУДЭНЦКАГА САЮЗУ ДА ЗМАГАНЬНЯ З МІЛІТАРЫСТАМІ.

ПЕКІН, 28 IV. Кітайскі студэнцкі саюз зьвярнуўся да студэнтаў усяго Кітаю з заклікам аб'яднацца ў барацьбе проці мілітарыстаў і імперыялістаў.

Рашаючыя дні ў Англіі.

Прамыслоўцы ідуць на ўступкі.— Урад пакладае ўсе сілы, каб адхіліць катастрофу.

ЛЁНДАН, 28-IV. Учора адбылося аб'яднанае пасяджэньне прадстаўнікоў вуглякопаў і ўласнікаў капальняў пад старшынствам Бальдвіна. Уласнікі капальняў згаджаюцца цяпер абмеркаваць пытаньне наконт згоды ў агульнаангельскім абхваце, але, як і раней, дамагаюцца зьнізіць заработак і павялічыць працоўны дзень. Бальдвін прапанаваў утварыць згоду на 5 гадоў. Усё залежыць ад пастановы саюзу вуглякопаў на канфэрэнцыі ўсеангельскага саюзу вуглякопаў, якая сёньня адчыняецца.

Сэкратар саюзу Кук заявіў, што пытаньне аб павялічэньні працоўнага дню ня будзе нават абмяркоўвацца.

„Дэйлі Гэральд" (газэта рабочае партыі) паведамляе, што ангельскі ўрад праз сакрэтны абежнік прапануе газэтам пісаць аб патрэбнасьці павялічыць працоўны дзень вуглякопаў.

„Ніводнага кілёграму чужога вугалю ў Англію".

Адозва аб'яднаньня рэвалюцыйных прафсаюзаў Францыі.

ПАРЫЖ, 28-IV. Аб'яднаньне рэвалюцыйных прафсаюзаў Францыі выдала адозву, у якой, тлумачачы абставіны барацьбы ангельскіх горнарабочых, завначае: „Перамога над ангельскімі горнарабочымі цяжка адаб'ецца на становішчы рабочых усяго сьвету. Калі ангельскія ўласьнікі капальняў здолеюць зьменшыць выдаткі ў вытворчасьці за кошт рабочых, дык прадпрыемцы іншых краёў будуць вымагаць таго-ж ад сваіх рабочых. Мы павінны дапамагчы ангельскім таварышом. Ніаднаго кілёграму вугалю ў Англію!»

Ліга Нацый „стабілізуе" франк.

ПАРЫЖ, 28 IV. Скліканая Лігаю Нацый міжнародная эканамічная канфэрэнцыя, якая адчынілася ў Жэневе, абмяркоўвае ў першую чэргу пытаньне наконт стабілізацыі вылют. Усе прамоўцы патрабуюць стабілізацыі франка з прычыны таго, што Францыя, пры зьніжэньні французскае валюты, зьяўляецца такім краем, які мае магчымасьць прадаваць свае тавары загранічаю таньней, чымся на ўнутраным рынку.

Там, дзе пануе буржуазея.

Зьніжэньне заработку ў Англіі

ЛЁНДАН. Водлуг матар'ялаў ангельскага міністэрства працы, у Англіі ў працягу 1925 г. заработак быў зьніжаны ў 13 цёх галінах прамысловасьці. Зьніжэньне заработку адбілася на 860 000 рабочых, галоўным чынам вугольнае і сталеліцейнае прамысловасьці, а таксама транспартных рабочых.

ЗАБАСТОЎКА ВЭНГЕРСКІХ ВУГЛЯКОПАЎ.

ВЕНА, 27-IV. Рабочыя самых буйных вэнгерскіх вугальных капальняў у Шальгатар'яне, якія маюць жабрацкі заработак, забасталі з прычыны новага зьніжэньня заработку і ўжываньня на прадпрыёмствах нянпоўнае нагрузкі працаю.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Справа Ілініча.

У ліпні 1925 году палітычная паліцыя арыштавала ў Варшаве вялікую „проціўдзяржаўную арганізацыю, на чале якое знаходзіўся нейкі Уладзімір Ілініч. У арганізацыі знаходзіліся некалькі афіцэраў польскае арміі.

27-га красавіка г.г. у Варшаўскім акруговым судзе пры зачыненых дзьвэрах пачаўся разгляд гэтае справы. Заклікана 80 сьведак. Разгляд справы будзе цягнуцца некалькі дзён.

Дэманстрацыя беспрацоўных.

27-га красавіка адбылася ў Варшаве вялікая дэманстрацыя беспрацоўных. Атрады конное паліцыі разагналі дэманстрацыю, а ў часе разгону палітычная паліцыя арыштавала 38 чалавек, абвінавачаных у распаўсюджваньні рэвалюцыйных адозваў.

Нарады нацменшасьцяў.

Пад старшынствам украінскага дэпутата д-ра Лявіцкага адбыліся 19-га і 22-га красавіка г. г. нарады, у якіх брали ўдзел дэлегаты беларускага і нямецкага соймавых клюбаў.

Нарада мела сваёю мэтаю апрацоўку супольнае палітычнае лініі пры сучасным урадавым крызісе ў Польшчы.

Палёт Варшава—Токіо.

Адзін з найлепшых польскіх вайсковых лётчыкаў палкоўнік Райс-і зробіць у палове мая вялікі палёт праз СССР у Японію.

За ўвесь палёт палёт Райскі хоча апускацца на зямлю толькі 6 разоў, з гэтае лічбы некалькі разоў на абшарах СССР.

З Райскім паляціць яго сталы мэханік—сэржант Кубяк.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Першамайскія адозвы.

Па ўсёй Віленшчыне раскіданы ўночы в 27-га на 28 ае красавіка адозвы, падпісаныя камітэтам камуністычнае партыі Зах. Беларусі.

Адозвы заклікаюць рабочую і сялянскую насельнасьць да масавых дэманстрацыяў проціў буржуазнага ўстрою ў Польшчы. У Алькеніках на чыгуначнай станцыі арыштаваны некалькі чалавек, западозраных у распаўсюджваньні гэтых адозваў.

Дабравольныя дэфэнзыўшчыкі.

Віленская арганізацыя нацыянальнае моладзі «Сокал» пастанавіла зьвярнуцца да ўлады з прапазыцыяй дапамогі віленскай паліцыі ў часе барацьбы з першамайскімі дэманстрацыямі рабочых. З гэткай жа прапазыцыяй зьвярнуўся да паліцыі Віленскі саюз афіцэраў рэзэрву.

Здрада пэпээсаў.

Віленскі акруговы камітэт ППС пастанавіў ня прымаць удзелу ў першамайскіх дэманстрацыях і абмежаваць мітынгамі ў зачыненых памяшканьнях.

Гэтая пастанова пэпээсаўскага камітэту паказвае сапраўдную вартасьць пэпээсаўскага „сацыялізму". Сваёй здрадаю рабочага сьвята і адсутнасьцю на вуліцах у дзень 1-га мая пэпээсы дапамогуць паліцыі ў разгоне дэманстрацыяў рабочых і прафэсыянальных арганізацыяў, якія, не зважаючы на здраду пэпээсаў, не адмаўляюцца ад вулічных дэманстрацыяў.

У Саюзных Рэспубліках.

У Маскву едзе Фынь-Юй-Сян.

ТРОЦКА-САЎСК, 28 IV. Учора ўвечары ў Троіцка-Саўск прыехаў кітайскі маршал Фынь-Юй Сян. Маршал выязджае сёньня ў Маскву праз Верхня-Удзінск.

125-я гадавіна „Красного Путиловца".

Прывітаньне пуцілаўцам ад УЦСПС.

У зьвязку з надыходзячым 30 га красавіка 125-цігодзьдзем ленінградзкага заводу «Красный Путиловец», УЦСПС зьвярнуўся да рабочых заводу з прывітаньнем, у якім гаворыцца: «Верныя рэвалюцыі пуцілаўцы прайшлі праз царскія астрогі і катаргу, праз агонь грамадзянскае вайны, голад і разруху, былі на барыкадах вялікага Кастрычніка, першымі на чырвоным франтох і пранейшаму ўяўляюць сабою прыклад пралетарскае зьяднанасьці і арганізаванасьці і высока трымаюць сьцяг ленінізму, сьцяг барацьбы за камунізм.

Хлебапрадукты СССР у Фінляндыю.

Фінляндзкая каапэрацыйная дэлегацыя пачала перамовы з Цэнтрасаюзам аб устанаўленьні цеснае дзелавое сувязі. Дэлегацыя заявіла, што дагэтуль фінляндзкая каапэрацыя закупала значную частку хлебапрадуктаў у Амэрыцы. Гэта надта ўзьнімала выдаткі на дастаўку закупленага. Фінляндзкая каапэрацыя хоча ў далейшым купляць хлебапрадукты ў СССР. Ёй выгодна купляць у нас і цукар.

Кінофільмы ў азнаменаваньне 10-е гадавіны Кастрычніка.

Калегія Наркамасьветы РСФСР хадайнічае перад Саветам Нар. Камісараў РСФСР аб асыгнаваньні 200.000 руб. на апрацоўку сцэнарыя і пастаноўку кіно фільмы па раману Джона Рыда „10 дзён, якія ўстрасьлі сьвет", і на падрыхтоўку другое карціны, на сцэнары якое будзе абвешчаны конкурс.

Абедзьве гэтыя фільмы прадбачыцца выпусьціць перад 10 ю гадавінаю Кастрычнікавае рэвалюцыі.

Пачаўся суд над вінаватымі ў самагубстве Гэшэліна.

АДЭСА, 28 IV. Пачалася слуханца справа доктара Юдэліса, які абвінавачваецца ў прыдзірках да доктара Гешэліна, у выніку чаго апошні пакончыў самагубствам. Абаронцы Юдэліса супярэчылі проці наданьня сям'і Гешэліна падаць Юдэлісу грамадзянскі іск. Яны пасылаюцца на тое, што Юдэліс пакуль што яшчэ ня прызнаны вінаватым, а в прычыны гэтага няма падстаў для падачы іску. Пракурор Масквін заяўляе, што калі суд прызнае Юдэліса вінаватым у самагубстве Гешэліна, дык адначасна паўстане пытаньне і аб неабходнасьці забясьпечыць жонку і дзіця нябожчыка. Суд згаджаецца з пракурорам.

Потым пачаўся допыт Юдэліса.

Жудасная катастрофа на Доксаўскай чыгуначнай каляіне.

ЛЕНІНГРАД. 29 IV. Сёньня на 16 й вярсьце Доксаўскае чыгуначнае каляіны здарылася катастрофа з людзкімі ахвярамі. Між станцыямі Доксава і Кушалёўка каля Мурына ўжо ў працягу месяцу рамантуецца чыгуначны мост праз рэчку Охту. Да яго пабудовы на рэчцы быў часовы мост. Паязды падыходзілі да гэтага мосту, пасажыры праходзілі праз яго і перасаджваліся ў поезд на другім баку.

Сёньня, каля 6 цёх гадзін раніцы да часовага мосту падышоў поезд. Пасажыры пабеглі праз мост, сьпяшаючы заняць месцы ў другім поезьдзе. Калі большасьць пасажыраў увышла на сярэдзіну мосту, ён абваліўся. Шмат пасажыраў зваліліся ў ваду. Частка з іх затанула, некаторыя спрабавалі выратаваць сябе на абломках ад мосту, але моцнаю плыньню іх адносіла нанiз. З Ленінграду хутка выехала на месца спэцыяльная камісія. Пасланы санітарныя вагоны і пажарная камаанда для адшукваньня ў вадзе трупаў. З вады выцягнута 8 чалавек. На абломках мосту выратавалася 12 чал. Водлуг слоў вачавідцаў, на месце ў момант катастрофы было больш 50-цёх чалавек. Пажарныя працуюць без перарыву, адшукваючы ахвяры.

Нячуванае разводзьдзе ў РСФСР.

КАЛУГА. Узровень вады на рэчцы Ацэ павялічыўся да 6 ці мэтраў 40 сантымэтраў. Частка гораду затоплена.

ТРОЇЦК. Напор разбушаванае стыхіі зьнёс лёдарэзы і новы мост на рэчцы Увельку. Затоплены вакольчныя вёскі. Жыхарства высяляецца ў цэнтр гораду. Спынены тэлеграфныя зносіны з Верхня-Уральскам.

ЯРАСЛАЎЛЬ. На Волзе поўны лёдаход. Вада бязупынна прыбывае. Чакаецца вялікае разводзьдзе. Растову пагражае затапленьне з боку возера Нэро, якое вельмі разьлілося.

ВАЛОГДА. Вада пачала спадаць. Разьлівам рэчкі затоплена большая частка гораду, у тым ліку механічны завод «Красный Пахарь».

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНСК. Разьлілі рэчкі Уводзь затапіў галоўныя адзьелы паркалёвае фабрыкі Зарацье-Вазьнясенскае мануфактуры. Фабрыка спыніла працу.

ШУЯ З прычыны разводзьдзя рэчкі Тэмзы спынена праца на маслабойным і лясапільным заводах.

Цікавая вынаходка ў фатаграфіі.

ЛЕНІНГРАД, 28 IV. Вынаходца фатограф Анастолі збудаваў фатаграфічны апарат з двума роўнафокуснымі аб'ектывамі. Дзякуючы гэтай сыстэме можна рабіць самыя складаныя марскія і назёмныя здымкі ў часе качкі на судне, або ў часе руху тых рэчаў, якія фатаграфуюцца.

Весткі адусюль.

Сьмерць вэтэрана Парыскае Камуны.

ПАРЫЖ, 28 IV. Памёр удзельнік Парыскае Камуны Жан Батыст Дуэ.

Адшкадаваньне князёў у Нямеччыне адкладаецца.

БЭРЛІН, 28 IV. Агэнцтва Вольфа паведамляе: юрыдычная камісія рэйхстагу адклала абгавор пытаньня аб кампрамісным упарадкаваньні прэтэнзій быўшых князёў на нязьядомы час пасьля таго, як прадстаўнікі ўсіх партый заявілі, што далейшы абгавор гэтага пытаньня ня дасьць зараз вынікаў.

Новае ў змаганьні з шкарлятынаю.

ЛЁНДАН, 28 IV. Дырэктар Пастэраўскага інстытуту ў Тунісе прафэсар Шарль Ніколь паведаміў французскую акадэмію навук аб тым, што ён здолеў ізаляваць узбудзіцеля шкарлятыны. У хуткім часе ён спадзяецца прыгатаваць сыраватку для барацьбы з гэтаю хваробаю.

Перамога „жывых" над „мёртвымі" ў Нью Ёрку.

НЬЮ ЁРК, 28-IV. Барацьба між прыхільнікамі жывое царквы і ціханаўцамі за ўладаньне расейскаю царкоўнаю маемасьцю ў Нью Ёрку (якая пяцігнулася 2 гады) скончылася перамогаю жывапаркоўнікаў. Вярхоўны суд штату Нью Ёрк ухваліў, што памяшканьне сабору сьв. Мікалая ў Нью-Ёрку належыць прадстаўніку жывое царквы арцыбіскупу Пятроўскаму.

Першая вялікая радыёстанцыя ў Пэрсіі.

ТЭГЕРАН. 27 красавіка ў Тэгэране адчынілася першая магутная пэрсідзкая радыёстанцыя, пабудованая савецкімі інжынэрамі. Усё тэхнічнае абсталяваньне станцыі выраблена на ленінградзкіх заводах.

Авіа-паштовыя зносіны СССР з Эўропай і Амэрыкай.

29-га красавіка аднаўляецца ўсходы прыём міжнароднае авіа-карэспандэнцыі ў краі Эўропы і Заходняе Амэрыкі.

Паход проці сьвяткаваньня 1-га мая

У ІТАЛІІ.

РЫМ, 28-IV. Італьянская рада міністраў забараніла 1-га мая ўсе працэсіі і дэманстрацыі.

ХІТРЫ ФРАНЦУСКАГА КАПІТАЛУ.

ПАРЫЖ, 28 IV. Буржуазныя газэты паведамляюць, што ўласьнікі шмат якіх французскіх прадпрыёмстваў абвяшчаюць 1-га мая непрацоўным днём, каб, такім парадкам, пазбавіць камуністаў прычыны наладжваць маніфэстацыі перад працуючымі ў гэты дзень прадпрыёмствамі. Адміністрацыя трамваю, мэтрапалітэну і аўтабусаў абвясьціла, што рабочыя гэтых прадпрыёмстваў, якія хочуць сьвяткаваць 1 га мая, будуць вызвалены ад працы, калі зробяць аб гэтым заяўку.

ЗАБАРОНА СЬВЯТКАВАНЬНЯ 1-га МАЯ Ў ПЕКІНЕ.

ПЕКІН, 28 IV. На тэрыторыях падначаленых У-Пэй Фу і Чжан-Цзо-Ліну забаронена сьвяткаваць 1 е мая.

АТРАДЫ «ПАДЗЁННЫХ» ПАЛІЦЭЙСКІХ ДЛЯ РАЗГОНУ ПЕРШАМАЙСКІХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ.

ВАРШАВА, 28 IV. Некаторыя газэты паведамляюць, што, з прычыны надыходу 1 мая, варшаўская паліцыя ўзмацняецца новымі сіламі. Атрады паліцыі папаўняюцца атрадамі «падзённых» паліцэйскіх. Ад наймітаў патрабуецца вольнасьць, каб яны ўмелі ўладаць зброяй і мелі надта вялікую фізычную сілу.

КАНАДЗКІЯ РАБОЧЫЯ ІДУЦЬ АДЗІНЫМ ФРОНТАМ З КАМУНІСТАМІ.

НЬЮ-ЁРК. Зьезд арганізацыі канадзкае рабочае партыі ў Антарыё большасьцю 116 галасоў проці 56 выказаўся проці выключэньня камуністаў з рабочае партыі. Прысутныя ў залі пасяджэньняў зьезду віталі гэтую пастанову сьпевам Інтэрнацыяналу.

„Турботы" Авэрэску аб Бэсарабіі.

ВЕНА, 28 IV. Румынскі ўрад назначыў генэрал-губарнатарам Бэсарабіі Раскану. Быўшы генэрал-губарнатар Бэсарабіі Міргіску назначан вайсковым міністрам.

Старшыня румынскага ўраду Авэрэску рэвам з міністрам па справах Бэсарабіі Нітца выехаў у Кішынёў. Мэта падарожжа—наладзіць муніцыпальныя выбары.

Значэньне II-й сэсіі ЦВК СССР для Беларусі.

(Гутарка са старш. ЦВК БССР т. А. Чарвяковым).

Другая сэсія вызначыла шляхі сацыялістычнага будаўніцтва СССР.—Савецкі Саюз не дазволіць паставіць сябе ў залежнасьць ад капіталістычных краёў.—Савецка-нямецкі ўгавор паказвае, што спробы абкружыць і ізаляваць СССР посьпеху ня маюць —Дзяржаўны бюджэт БССР павялічваецца на 90 проц., мясцовы на 30 проц.—Бюджэт прадбачыць вялізарнае ў беларускіх умовах прамысловае будаўніцтва.—Новы закон аб сельска-гас падарчым падатку патрабуе вялікае і ўважлівае падрыхтоўкі.—Лепшая практыка будаўніцтва Савецкае Украіны павінна быць перанесена ў БССР.

Другая сэсія ЦВК СССР мае асаблівае значэньне дзеля таго, што яна павінна была канкрэтна вызначыць шляхі далейшага сацыялістычнага будаўніцтва савецкае дзяржавы.

Гэта тым больш важна, што аб гэтым вялася дыскусія на 14 партыйным зьезьдзе. Сэсія дала адказы на вельмі важныя пытаньні.

На сэсіі было прадэманстравана значэньне Савецкага Саюзу ў міжнародных дачыненьнях. Даклад намесьніка Народнага Камісара Замежных Спраў т. Ліцьвінава вусім яскрава паказаў, што Савецкі Саюз не дазволіць паставіць сябе ў залежнасьць ад пасобных капіталістычных дзяржаў, або іх аб'яднаньняў.

З другога боку, усе спробы капіталістычнага сьвету абкружыць і ізаляваць СССР таксама ня будуць мець посьпеху. Пра гэта сьведчыць утварэньне савецка-нямецкага ўгавору, паведамленьне аб чым было атрымана на сэсіі.

Усё гэта стварае магчымасьць больш спакойна і ўпэўнена накіроўваць увагу працоўных мас Савецкага Саюзу на вырашэньне ўнутраных гаспадарчых задач. У бягучы час гэткімі задачамі зьяўляюцца: 1) індустрыялізацыя краю, 2) павялічэньне тавараў на рынку, 3) барацьба за ўмацаваньне грашовае сыстэмы і 4) цьвёрды бюджэт.

Маючы на ўвазе гэтыя задачы, 2-ая сэсія разгледзіла і зацьвердзіла бюджэт на 1925 26 год. Перад разглядам бюджэту на сэсіі, ён быў уважліва разгледжан і праработан у бюджэтнай камісіі, якая складалася з прадстаўнікоў рэспублік, абласьцей, ведамстваў і проста рабочых і сялян, сяброў ЦВК. Былі ўжыты меры да таго, каб скараціць усе непрадукцыйныя выдаткі, а таксама тыя выдаткі, без якіх можна абыйсьціся ў гэтым годзе. Бюджэт складзен ня толькі без дэфіцыту, але так, што ў дзяржавы астаецца запасу 100 ліл. рублей.

Для Беларусі бюджэт бягучага году мае асаблівае значэньне дзеля таго, што: 1) дзяржаўны бюджэт БССР павялічаецца на 90 проц., а мясцовы да 30 проц. 2) бюджэт БССР аддае большасьць сродкаў на ўмацаваньне прамысловасьці і сельскае гаспадаркі Беларусі, 3) бюджэт прадбачае вялізарнае ў беларускіх умовах прамысловае будаўніцтва, на што выпучана каля 10 мільёнаў рублёў, 4) зьвернута ўвага на ўмацаваньне мясцовых бюджэтаў Беларусі і 5) калі вызначаліся сродкі, якія адпусьціў СССР для БССР, былі асабліва ўважліва падлічаны ўсе нацыянальныя асаблівасьці Беларусі і яе прыгранічнае становішча.

У зьвязку з апошнім ужыты крокі да таго, каб зьменшыць падатковы цяжар і павялічыць водпуск сродкаў.

Шмат ўвагі сэсія аддала разгляду закону аб сельска-гаспадарчым падатку і палажэньня аб мясцовых фінансах. Закон аб сельска-гаспадарчым падатку зацьверджан. У 1926 27 годзе падатак будзе зьбірацца на падставе гэтага закону.

Вось галоўнае з гэтага закону: 1) наблізжэньне адзінага сельска-гаспадарчага падатку да прагрэсыўна-падаходнага, 2) зьмяншэньне падатку з беднаты, 3) перанясеньне большага цяжару на больш заможных, 4) падзік усіх крыніц прыбытку ў сельскай гаспадарцы, 5) пашырэньне правоў мясцовых саветаў у справе вылічэньня і спагнаньня сельска-гаспадарчага падатку і 6) перадача большае часткі падатку ва ўладальненьне мясцовых і рэспубліканскіх патрэб.

Правядзеньне гэтага падатку патрабуе ад усяго савецкага апарату большае і ўважлівае падрыхтоўкі. Кожны з нас ведае, што стары падатак не здавальняў сялянства, бо ён неаднолькава разьмяркоўваў падатковы цяжар Дзеля гэта трэба ўжыць усе заходы да таго, каб асноўныя прынцыпы новага закону былі па магчымасьці цалкам ажыцьцёўлены.

Палажэньне аб мясцовых фінансах значна пашырае правы мясцовых саветаў і стварае моцны фінансавы грунт для гаспадарчай культурнай і адміністрацыйнай працы на мясцох.

Для БССР мае вялікую цікавасьць даклад на сэсіі ўкраінскага ўраду. У варунках унутранога і замежнага становішча Украіны і Беларусі, у гісторыі іх рэвалюцыйнага змаганьня, а таксама ў далейшых задачах ёсьць шмат агульнага. Дзеля гэтага і шляхі далейшага будаўніцтва Савецкае Украіны і Савецкае Беларусі шмат у чым супадаюць Савецкая Украіна ў эканамічных адносінах зьяўляецца больш моцнаю, яна пражыла больш доўгую пару барацьбы за нацыянальную культуру, а ў зьвязку з гэтым і больш значныя дасягненьні. Натуральна, што праца і дасягненьні Украіны зьяўляюцца прыкладам, які дае нам магчымасьць пераняць лепшае з украінскае практыкі. Даючы агульную ацэнку сацыялістычнага будаўніцтва Савецкае Украіны можна сказаць, што на прыкладзе Украіны мы атрымалі добрае сьцьвярджэньне таго, як правільная нацыянальная палітыка камуністычнае партыі яднае наўкола партыі і ўлады лепшыя сілы, накіроўваючы іх на змаганьне з капіталізмам за сацыялізм.

Трэба адзначыць асаблівы характар працы мінулай сэсіі. Сэсія доўга цягнулася. Калі ўзяць пад увагу і працу бюджэтнае камісіі, дык можна сказаць, што сэсія працавала каля месяца. Гэта сьведчыць аб тым, што праца ВЦК набывае ўсё большае значэньне ў жыцьці савецкае дзяржавы. У пасьпяховай працы сэсіі вельмі важнае значэньне мела актыўнасьць сяброў абодвых палат—Саюзнага Савету і Савету Нацыянальнасьцяй.

Сэсія канкрэтна вызначыла шляхі далейшага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу. Яна дала шэраг заданьняў на месцы, забясьпечыўшы ім магчымасьць выявіць уласны пачын, каб выканаць гэтыя заданьні. Сэсія прыцягнула ўвагу рабочых і сялян Савецкага Саюзу да аднаўленьня гаспадаркі і далейшага будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі ў варунках капіталістычнага абкруженьня.

6 ГОД САВЕЦКАГА АЗЕРБАЙДЖАНУ.

БАКУ, 27-IV. Споўнілася 6-ая гадавіна ўстанаўленьня савецкае ўлады ў Азэрбайджане. 27 красавіка 1920 г. бакінскія рабочыя скасавалі мусаватскі ўрад і ўстанавілі ў сябе савецкую ўладу.

У зьвязку з гадавінаю, ЦВК Азэрбайджану зьвярнуўся да працоўных рэспублікі з адозвай, у якой адзначаецца, што адсталы Азэрбайджан у часы царызму і мусавата зараз робіцца прыкладам для ўсіх народнасьцяў абуджанага і паўстаючага Усходу. У дарскія часы на тэрыторыі цяперашняга Азэрбайджану вучылася ў школах 18.000 пераважна дзяцей буржуазеі, кулацтва і гарадзкога чыноўніцтва. Зараз у 1700 школах навучаецца больш 160.000, з якіх 90 проц. дзеці рабочых і сялян.

Увесь Азэрбайджан ахоплен зараз працаю ў галіне земляўпарадкаваньня. Агульная засяўная плошча ў 1925 г. дасягнула 856 000 дзесяцін; у гэтым жа годзе яна будзе даведзена да 900 000 дзес. проціў 680 000 дзес. да саветызацыі. Бавоўнаю ў 1925 годзе было засеяна 87.000 дзес.; у гэтым годзе прадбачыцца засеяць 97 000 дзес. проціў 400 дзес. да саветызацыі. У выніку агракультурных мерапрыёмстваў ураджайнасьць бавоўны дасягнула 41-га пуда з дзесяціны, проціў 28 ў 1921 годзе.

Ня меншыя посьпехі і ў галіне прамысловасьці. На прамыслах Азнафты эксплёатуецца больш 2 500 шчылін проціў 1.000 у 1920 г. Выпрацоўка тэкстыльнае прамысловасьці перавысіла на 40 проц. даваенную норму. Распрацоўка серкавага калчадану, якая спынілася ў 1917 годзе і пачалася ізноў у 1923 г. з гадовай здобыччу ў 1000 пудоў, дасягае зараз 100.000 пуд.

У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Нашы дасягненьні на грунце калектыўнай працы.

К 1-му мая 30 пісьменных.

(В Крушынаўка, Рагач р., Бабруйшчына)

Наша вёска цёмная і забітая. Буржуазная ўлада пакінула нам у спадчыну 80 проц. няпісьменных. Пры савецкай уладзе наша няпісьменнасьць зьнішчаецца. У сёлетнім годзе мы выпускаем 30 чал. пісьменных, якія ўсю зіму працавалі над сваёй адукацыяй. Адно дрэнна, што дагэтуль на ліквпункты ня ўцягнута ніводная жанчына; гэта тлумачыцца тым, што сярод жанчын не праводзіцца ніякае працы, нават няма дэлегаткі, у выніку чаго—поўная няпісьменнасьць сярод жанчын.

Па свайму ўзросту выпускаемыя з ліквпункту—па большай частцы хлопцы, якія ў час імпэрыялістычнае вайны не маглі навучацца, бо іх бацькі былі на вайне і ім прыходзілася весьці хатнюю гаспадарку. Лёзунг—«к 10 цігодзьдзю Кастрычнікавае рэвалюцыі ніводнага няпісьменнага»—ажыцьцёвіць ня ўдасца, бо шмат яшчэ ёсьць няпісьменных, ды і сродкаў на леманатары, алоўкі і інш. няма, а тых, што адпускае райкультадзел, дзелёка не хапае.

Але ўсё ж такі тое, што зроблена, трэба лічыць вялікім дасягненьнем ў такім пёмным кутку. З наступнага году трэба прыслаць спэцыяльна ліквідатара, тады мы хутчэй вызвалімся ад нашага лютага ворага—няпісьменнасьці, тады толькі магчыма будаваць жыцьцё на новы лад

Селькор Я. Савіцкі.

Год працы кватэрнай каапэрацыі.

(Н.-Барысаў).

Калі азірнуцца назад і паглядзець на кватэрнае становішча рабочых у мінулым годзе, дык можна ўбачыць, што летась к дню першага мая кватэрны крызіс займаў досыць значнае месца. Па невялікі рабочых сем'яў зьбіваліся ў адну маленькую кватэру, куды рэдка заходзіла сьвежае паветра і заўсёды было брудна.

Такое кватэрнае становішча ўзварушыла нашы фабрычныя камітэты і прымусіла іх задумацца над тым, як палепшыць кватэрную справу. І вось пасьля 1 мая 1925 г. пры некаторых фабрыках і заводах Н. Барысава былі арганізаваны кватэрныя каапэратывы, якія хутка зацікавілі рабочых. Рабочыя сталі ўносіць паі залічваліся сябрамі гэтай каапэрацыі. К 1 мая 25 г. кватэрная каапэрацыя пабудавала 10 новых хат.

Чаму навучаюцца рабочыя сем'і, жывучы ў гэтых хатах? Напэршае трэба сказаць, што хаты пабудованы накшталт інтэрнату; адна печка абслугоўвае некалькі гаспадыняў, але яны паміж сабою ніколі не сварацца і ня б'юцца (як гэта рабілі яны калісьці), а жывуць у самых найлепшых жыцьцёвых і гаспадарчых адносінах. Гэтыя рабочыя хаты прывучаюць рабочыя сем'і і нават самых рабочых да калектыўнага жыцьця.

Рабочыя кватэрнае каапэрацыі за кароткі час існаваньня каапэрацыі паказалі сябе сярод рабочых з вельмі добраго боку.

С Клопаў.

Агульнымі сіламі шырым культуру.

(В.-Шчакатова, Дрыбынскі р., Аршаншчына).

Наша вёска памаленьку перабудоўваецца на новы лад. Ня было ў нашай вёсцы бібліятэкі,—забраліся, пагаманілі і парашылі наладзіць яе. Пачалі зносіць, у каго якія былі кніжкі. Хто адну, хто дзьве, пяць, а некаторыя па дзесяць і нат адзін да-40 кніжак. Сёньня маем бібліятэку з лікам чытачоў да 75 чалавек. Праўда бібліятэка маладая, было-б добра, каб хто небудзь узяў шэфства.

Ня было нардому, а ў кутнім часе будзе. Пагаманілі сабраўшыся і парашылі адрамантаваць стары закінуты магазын, які ўжо не адзін год гніў, стоячы на дажджы. Прывезьлі лесу, і моладзь дружна ўзялася за працу. **Першы май** будзем сьвяткаваць ужо ў новым адрамантаваным будынку.

У гэтай агульнай калектыўнай працы характэрна тое, што прымае ўдзел галоўным чынам бядняцтва.

Выдана ячэйкай ЛКСМБ насьценная газэта, у якой значнае месца займае падрыхтоўка да пасеву, а агульны сход КСМ ухваліў: «Кожны член ячэйкі, акрамя ачысткі насеньня, павінен таксама сеяць у сёлетнім годзе лубін, канюшыну, віку і г. д. Уцягнуць у гэта сельска гаспадарчы гурток і вясковы актыў».

Былі зроблены даклады настаўнікамі на агульным сходзе ячэйкі, дзе прысутнічала шмат і беспартыйных, аб пасяўной кампаніі і с-г. каапэрацыі.

Было шмат жывых спрэчак, а ў канцы згадзіліся на неабходнасьці пераходзіць на новае гаспадараньне.

М. П—ка.

Палепшаньне нашай сельскай гаспадаркі.

Сёлетнія веснавыя ўмовы для палявой працы ў **Барысаўшчыне** значна лепшыя, чымся летась. Летась плошча пахаты павялічылася на 5,9 проц. у параўнаньні з даваенным часам, гадоўля каней павялічылася на 12,6 проц., рагатай жывёлы—на 30 проц. Гэтым павялічылася і агульная прадукцыя сельскае гаспадаркі в рэштаю (апроч выдаткаў на вытворчасьць прадукцыі) на аднаго жыхара ў 19,2 пудоў проці 4,9 пудоў у 1924 годзе.

У залежнасьці ад гэтага павінны быць зьменены і тыя мэтады, якімі будзе праводзіцца сельска-гаспадарчая кампанія: ня трэба шмат клапаціцца, каб павялічыць засеўную плошчу, ня трэба клапаціцца аб дастаўцы насеннага збожжа, бо насеньня ў акрузе хватае.

Што-ж тычыцца бядняцкіх гаспадарак, якім патрэбна пазыка насеньня, дык яны будуць здаволены сродкамі камітэтаў узаемадапамогі. Апошнія да таго-ж падмацоўваюцца дзяржаўным фондам у 9 000 рублёў, а таксама павялічэньнем сельска-гаспадарчага крэдыту.

Галоўная ўвага сёлетняе кампаніі павінна быць згрунтована на інтэнсіфікацыі сельскае гаспадаркі шляхам пашырэньня плошчы пад кармавыя травы, лубін шляхам ужываньня травянога ўгнаеньня, сартыроўкі збожжа, шляхам палепшаньня якасьці быдла.

Якія-ж прычыны вымагаюць ажыцьцёўленьня гэтых задач?

Перш за ўсё—угнаеньне.

Асноўным угнаеньнем нашае вёскі зьяўляецца гной, якога ў акрузе ёсьць (грунтуючыся па ліку быдла) 102.220 тысяч пудоў. Гэтым гноем можна ўгнаіць толькі 24 тысячы дзесяцін (водлуг сярэдняе нормы ўгнаеньня па 1.600 пудоў на дзесяціну). Трэба-ж угнаіць плошчу ў 100 тысяч дзесяцін, з якіх 17 тысяч заняты лубінам і віко ю. Такім парадкам застаецца яшчэ блізка 36-ці тысяч дзесяцін, для якіх патрэбна штучнае ўгнаеньне.

Зроблена заяўка на 9.380 пудоў мінэральнага ўгнаеньня, але нельга спадзявацца на здаволеньне заяўкі цалкам. З гэтае прычыны паўстае пытаньне аб пашырэньні плошчы засеву лубінам.

Далей—пра кармавыя травы. Водлуг прыблізных падлікаў, жыхарства мае 80 проц. патрэбнага насеньня траў.

На акругу патрэбна яшчэ 520 пудоў канюшыны, 800 пудоў вікі, 500 пудоў сэрадэлі, 1950 пудоў лубіну і 15 пудоў цімафееўкі. На гэты лік насеньня зроблена заяўка. Апроч таго, набываецца лубін у тых райёнах, дзе ёсьць лішкі.

Насеньне будзе дастаўляцца праз нізавую каапэрацыйную сетку і аддзяленьне сельска гаспадарчага складу.

Адною з абавязковых умоў павялічэньня ўраджайнасьці зьяўляецца сартыроўка насеньня, якая распачалася ў акрузе яшчэ летась са сьнежня. Для гэтай працы ўзяты на вучот усе машыны, прычым сапсаваныя адрамантаваны. Мае быць арганізавана 11 перасоўных абозаў з 26-цю машынамі і 14 стацыянарных пунктаў з 40 машынамі з агульнаю прапускною здольнасьцю ў 106 тысяч пудоў. Сартыроўка будзе праводзіцца часткаю бясплатна, а часткаю за мінімальную аплату ў 1-2 капейкі за пуд.

Вялікае значэньне мае і рацыяналізацыя жывёлагадоўлі.

Наш сялянскі конь—малы і нядужы, малочнае быдла—мала прадукцыйнае. Патрэбна палепшаньне.

У гэтай галіне нам перашкаджае нястача добрых праізвадзіцеляў. У выніку зробленага вучоту па акрузе будзе выкарыстана 108 гатунковых жарабцоў, 61 бык і 23 кныры.

Калі лічыць, што кожны жарабец пакрые 30 матак (108×30=3240), а бык—40 (61×40=2440) дык у выніку будзем мець 5680 галоў палепшанага маладняку.

Ажыцьцяўленьне, пры актыўным удзеле самаго жыхарства, памянёных задач забясьпечыць павялічэньне матар'яльнага, а разам з тым і культурнага ўзроўню сялянства.

Машынін.

Настаўніцтва рыхтуецца да II-га ўсебеларускага зьезду.

Каб выбраць сваіх прадстаўнікоў на зьезд, 11-га красавіка быў склікан зьезд настаўніцтва **Чэрвенскага р** (Меншчына). Самая распуціца, гразь, а настаўніцтва на зьезьдзе амаль поўнасьцю.

Даклад аб задачах усебеларускага зьезду зрабіў прадстаўнік ЦСПСБ.

Пасьля ўважлівых абгаварваньняў абраны тры дэлегаты: 2 настаўнікі тыповых вясковых школ і адзін ад нацменшасьцяў—настаўнік яўрэйскай самігодкі.

Надта зацікавіў настаўніцтва даклад камандзіра № тэрыт. палка аб ролі настаўніцтва і ваенізацыі ў зьвязку з агульным міжнародным палажэньнем

Дакладчык спыніўся на асаблівай вартасьці зьнішчэньня ў першую чаргу няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў і пераменьнікаў, ролі настаўніцтва ў падняцьці палітычнай сьвядомасьці жыхарства, у замацоўваньні цеснай сувязі настаўніцтва з райённым Ваенна-Навуковым Таварыствам. **Настаўнік.**

Чаму вучыць вясна гэтага году.

Вёска стогне ад бяскорміцы. Напэўна 30 проц. сялянства ўжо зачысьціла да апошняй саломінкі свае гумны. Корму ані каліва, вецер гуляе ў пунях, а між тым на дварэ яшчэ холадна, і яшчэ ня скора можна будзе выпусьціць жывёлу на пашу. Бядуе, селянін, са смуткам зьглядзе ў хлеў на схудзеўшую жывёлу.

Што-ж можа зьявіцца дапамогай, што можа даць корм жывёле ў гаспадарцы? Першае, гэта паляпшэньне сенажацяў, якія зараз даюць надта мала сена. І калі мы ня будзем уводзіць паляпшэньня, дык і саўсім ня будуць даваць яго. А між іншым адно баранаванне вясновае можа падняць ураджай сена на 20 п. на дзесяціну.

Эх, як міны былі-бы яны цяпер, у час такога цяжкага становішча.

Праўда, селянін часта ня ведае гэтага, і аграном ня можа, дзеля адсутнасьці часу, дапамагчы ў гэтым сялянам. У гэтым выпадку трэба, каб селянін сам ішоў к аграному і пытаў яго, што рабіць. Другое, калі ёсьць у вёсцы гурток, у якім кіруе аграном, паставіць пытаньне аб гэтым, а не казаць у агульным рысах, а трэба больш застанаўліваца на самай тэхніцы паляпшэньня і інш.

Далей, трэба ламаць стары севазварот, трэба ўводзіць такі, дзе можна-б было сеяць канюшыну, вікавую зьмесь, кармовыя буракі. Жыцьцё патрабуе гэтага, неабходнасьць ставіць такое пытаньне. Толькі пры выкананьні гэтых задач гаспадарка ня сустрэнецца з недахватам, гаспадарка стане прыбытковаю і жывёла заўсёды будзе не галодная. Хіба можна чакаць малака ад каровы, калі яна корміцца саломаю са старых стрэх. Ніколі ў гаспадарцы ня будзе малака, масла, калі будзе так абстаяць справа.

Цяжкае становішча вучыць, вясна вучыць, трэба, маючы на ўвазе вопыт мінулага, крануцца парваць усё старое ў гаспадарцы, найсьці па шляху ўвядзеньня новых мерапрыёмстваў, па шляху перабудовы. **А. Веснавы.**

Ахова помнікаў старажытнасьці.

Гістарычны заказьнік.

Каля вёскі Чаркасава, Межэўскага сельсавету, **Аршанскага раёну**, на палёх быўшага маёнтку, шчыльным ланцугом, на абшары 8 дзесяцін, цягнуцца старасьвецкія курганы. Жыхары акаляючых вёсак лічаць іх швэдзкімі могілкамі. Частка курганоў была пад лесам, але ў апошнія гады лес быў высечан, маёнтак пабіўся на хутары і хутаране пачалі распахваць зямлю ня толькі паміж курганамі, але разрываць і самыя курганы.

Аршанскае лясьніцтва перадало гэтую плошчу Аршанскаму акруговаму таварыству краязнаўства для арганізацыі заказьніка. Дагавор аб перадачы гэтай мясцовасьці акруговаму таварыству быў падпісан 6-га лютага, і акруговае таварыства ўхваліла арганізаваць гістарычны заказьнік плошчай у 8 дзесяцін, зноў засадзіць гэтую мясцовасьць лесам, назіраць не і ахову заказьніка ўскласьці на А-ш нскае райёнае таварыства краязнаўства. Апроч гэтага, у хуткім часе павінна выйсьці абавязковая пастанова прэзыдыуму Акрвыканкому аб рэгістрацыі, учоце і ахове помнікаў старажытнасьці на тэрыторыі акругі. Гэтая задача ўскладаецца на АКРАНА і РАЙАНА. Ахова помнікаў старажытнасьці на мясцох ускладаецца на райвыканкомы і сельсаветы.

Што датычыцца кургоноў каля вёскі Чаркасава, то яна шмат старэй швэдскай вайны.

У старадаўных актах 17-га стагодзьдзя якія захоўваюцца ў Віцебскім архіве, ёсьць продажныя запісы на Чаркасава і суседнія вёскі, у якіх успамінаюцца гэтыя магілкі.

Д. Васілеўскі.

Рабочае жыцьцё.

1-ае мая 1914 г. на заводзе.

(Успаміны менскага рабочага).

Даўно было гэта... памятаецца 1914 год, калі ўжо навісьлі хвалі вайны з Нямеччынай.

Досыць вялікі ў той час быў Менскі чыгунна-ліцейны завод Майзельса і Шлапакова. Чыгунна-ліцейная кіпела, як пекла. Каля 150 чал. працавала там.

Ня раз перад першым маем у мінулыя гады зьяўляліся жандары да станкоў, арыштоўваючы таго ці іншага рабочага.

Раней здавалася рабочым:

— Злодзея злавілі...

Але калі гэтых «злодзеяў» высылалі на 7-8 год у Сібір, і знаходзілі ў хаце пад матрацам праклямацыю пі адову, то сталі разумець, што зя злодзея гэта кінулі ў рудвікі, а таго... аб кім можна было гаварыць і шкадаваць «на вушка» свайму таварышу.

Падыходзіў май 1914 г... Ліхарадка сярод хмурых закапцелых фігур. Як будзем сьвяткаваць?—пытаюцца адзін другога.

У гэты час на завод у часе абеду стаў падбягаць нейкі тып з казьлінай бародкай, які выдаваў сябе за прыяцеля рабочых.

Як пазьней даведаліся аб ім рабочыя, то ён быў правакатарам.

— Брацьця!!!—бывала кажа ён, паказваючы на сонца:—вось наша зьвязда, вось сонца, якое з божжай дапамогай давядзе нас да свабоды...

Затым ён пачынаў разьвіваць нейкія імглістыя пэрспэктывы, каб захапіць у свае рукі друк.

— Нам неабходна перарэзаць правады, захапіць друкарню і друкаваць...

Рабочыя з гэтай прычыны лічылі, што ён альбо шалёны, альбо шпік. Ліцейшчыкі далі яму клічку «Багамол».

«Багамолам» быў таксама складзен праэкт маёўкі ў Антонаўку—3 вярсты за горадам.

Настаў урочны дзень..

Рабочыя на гэты час прынялі некаторыя прадасьцярогі.

Умова была—за тры вярсты ад Антонаўскага возера, на апушцы лесу сабрацца ўсім.

Дайшлі да возера... калі з аднаго з пікетаў раздаўся прадасьцярожны сьвіст. Аказалася, што з боку Сьляпянкі скакала на месца сходу коўная жандармэрыя, а «Багамола» таксама ўбачылі на ўмоўным месцы з нейкім суб'ектам. Струхнулі хлопцы зрыху... і асьцярожна сталі разыходзіцца па дамох.

На другі дзень рабочыя з форсам падвязалі „Багамолу“ паперку, змочаную газай, падпалілі і вывелі яго за вароты. Больш ён на завод не зьяўляўся.

Ю.

Барацьба за якасьць прадукцыі.

(Віцебск, завод Мэтпрому № 3).

Нядаўна на заводзе Метпрому № 3 былася цэхавая вытворчая нарада. Як сабралася ў першы раз нарада прайшло амаль што 5 месяцаў. Нарада адзначыла шмат недахватаў у плужным цэху.

На нарадзе прысутнічала больш паловы рабочых плужнога цэху. Інструктарам цэху было адзначана шмат недахватаў у вырабу паўфабрыкатаў. Рабочыя ня зусім уважліва адносяцца да працы, што адбіваецца ня толькі на якасьці вырабу, але і на ходзе ўсёй працы.

Па гэтаму пытаньню выказалася шмат прысутнічаўшых рабочых Зьвярнулі ўвагу на тое, што пры прыёмцы паўфабрыкатаў прыёмшчык зьвяртае ўвагу толькі на колькасьць тавару і зусім не зварачвае ўвагі на якасьць. Адзначан нядобры падбор кваліфікаваных рабочых, з прычыны чаго ёсьць шмат недахватаў у кавальнай працы. Няправільна рэжуцца лемяхі. Дзякуючы няправільнай меры дзірак пры зборцы лямяхі не падходзяць адзін да другога. Зборшчыку прыходзіцца траціць лішні час на працу, якая да яго не адносіцца. Была прапанова аб пераходзе штампоўкі паўфабрыкатаў машынай, што да гэтага часу вытваралася саматужным парадкам.

Далей старшыня завкому адзначыў цэлы шэраг недахватаў у працы заводу. Для зьнішчэньня ўсіх пералічаных недахватаў ён прапануе, каб на кожнай кавальскай рэчы ставіць асобны нумар (нумар таго рабочага, які зрабіў гэтую рэч). Такім чынам мы паменшым процант браку і палепшым працу зборшчыка, бо пры такіх умовах кожны рабочы будзе несьці адказнасьць за сваю працу.

Шмат чаго яшчэ гаварылі аб іншых дробязных недахватах у працы заводу.

Ухвалена зрабіць для кожнага рабочага-каваля нумар і на ўсе зробленыя ім рэчы ставіць і здаваць пад яго асобным нумарам. Вылучыць аднаго рабочага для падрыхтоўкі кружал.

На гэтым нарада і скончылася, адклаўшы шмат пытаньняў да другой чарговай нарады.

А.

„Дойная карова“.

—Што гэта, ці ж мы дойная карова, што вы без канца вымагаеце для вашага клюбу грошай...—так адказаў адзін з сяброў прэзыдыуму нашага саюзу, калі праўленьне клюбу зьвярнулася за выдачаю 150 ці рублёў на першамайскую кампанію.

—Нельга так неабдумана вырашаць такія важныя і складаныя пытаньні.—гаворыць за ім другі сябар прэзыдыуму. 150 рублёў гэта велізарная сума, для выдачы якое патрэбен увесь прэзыдыум у поўным складзе.

—Але даволье,—адчайна непакоіцца сябра праўленьня клюбу,—мы рыхтуемся да 1-га мая, мы разгортваем вялікую працу, наш драматычны гурток ужо цэлы месяц рыхтуе жывую часопісь, мы абслугоўваем маёўскія дні ня толькі сяброў клюбу, але і саюзу.

—Нічога ня значыць, грошы трэба выдаваць з разьлікам, з толкам, ведаеце, зараз іншая кампанія, рэжым эканоміі.

Такая размова адбывалася ў „кулуарах“ клюбу між сябрамі праўленьня клюбу і сябрамі прэзыдыуму саюзу. Размова гэта зьяўляецца вельмі характэрнаю для працы нашага клюбу. Нібыта існуе два лягеры, дзьве „варожых“ асобы. Адна патрабуе, а другая адмахіваецца.

Няшчасны прэзыдыум саюзу. параўняў сябе з дойнаю каровю, а ненасытныя кіраўнікі клюбу вышчадна дояць і дояць яго.

Было-б сьмешна, каб ня было так цяжка. Справа ў тым, што наш клюб распачаў сваю працу толькі ў сьнежні. Ён абслугоўвае ня толькі сяброў клюбу (блізка 2 000 чал.), але і ўсю саюзную масу. Прэзыдыум-жа саюзу дае ў месяц толькі 700 рублёў. З гэтых грошай трэба аплачваць кіраўніка фізкультуры, які, галоўным парадкам, абслугоўвае саюзную моладзь.

І вось цяпер, напярэдадні 1-га мая, калі ў клюбе ў літаральным сэнсе слова кіпіць праца, калі патрэбна ўсяго толькі 150 рублёў дапамогі, дык наш прэзыдыум саюзу, нечакана, становіцца дойнаю каровяю.

А лік сяброў клюбу расьце штодзённа, актыўнасьць разьвіваецца... толькі сродкаў няма.

З гэтае прычыны праўленьне клюбу, каб скараціць выдаткі, ухваліла (5-ю галасамі проці 4 х) ліквідаваць літэратурны гурток, спыніць працу гуртка „ИЗО“, а надалей скасаваць яшчэ некалькі гурткоў.

А сродкаў усё-ж такі няма.

Леўскі.

Як мы расьцём.

(Завод „Беларусь“, Менск).

З кожным днём мацнее і пашыраецца праца Менскага броварнага заводу „Беларусь“. У сучасны момант на ім занята 114 чалавек. Нядаўна на заводзе быў праведзен рамонт, зьмянілі кацёл. Гэта яшчэ больш падняла прадукцыйнасьць нашага заводу.

Цяпер завод ужо перайшоў зададзеную норму вытворчасьці на 122 проц. Заработная плата рабочых таксама не стаіць на адным месцы. За апошні час яна паднялася на 25 проц.

Прастояў на заводзе мала Ня любяць рабочыя гультаёў. Пастановы вытворчай камісіі (праца апошняй моцна адчуваецца ў нас) яшчэ больш паляпшаюць завод.

Зараз мы павялі барацьбу з накладнымі выдаткамі, якіх мы ўжо скарацілі на 13 проц.

Рабкор.

ХРОНІКА.

Сад мэталістаў.

ЦП саюзу мэталістаў асыгнавала 1.200 р. з сродкаў культфонду на абсталяваньне летняга саду мэталістаў пры электрастанцыі.

Адчыненьне саду адбудзецца 2 га мая.

Адпачынак для друкароў.

На летні пэрыяд Менская страхкаса дала ў распараджэньне ЦП саюзу друкароў 60 месц.

ЦП разьмеркавала іх гэтак: 1-й друкарні—19 м., 2-й—7 м., фабрыцы „Палігр ф“—4 м., канвэртнай фабрыцы—3 м., шпалернай фабрыцы—6 м. працкалектыву—5 м., фабрыцы Лошыцэра—1 м., дробным прыватным прадпрыемствам—2 м., друкарні Дзярж. Паліг. Управы 2 м., друкарні Пацыву—1 м., школе фабзавуча—5 м., Дзярж. Выдав.—3 м., і ў запасе—2 м.

Адпачынак для хімікаў.

ЦП саюзу хімікаў разьмеркавала 50 месц у доме адпачынку, даўшы завкому заводу „Пролетарий“—22 месц, „Профинтерн“—10 м, Менскаму мясцкому—5 м., „Красный Химик“—5 м., камслужу Белшклотрэсту—3 м. і за ЦП астаецца—5 м.

Што зрабіў Белсельсаюз да веснавое пасеўнае кампаніі.

Уся маса тавараў, якую загатовілі Белсельсаюз і яго мясцовыя аддзяленьні, ужо прасунута ў вёску. Сяляне ўжо раскупілі большую частку гэтых тавараў.

Ад Віцебскага заводу ў лік угавору было атрымана 20.000 плугоў, якія цалкам адпраўлены ў вёску і ўжо прададзевы, але попыт не аслабявае. Віцебскі Сельсаюз прадаў 6000 плугоў і зараз на сваіх складах ня мае ніякіх запасаў.

Ня меншы попыт на спружынавыя бароны. На 20 красавіка сельска-гаспадарчая каапэрацыя Беларусі прадала 4.000 гэтых барон. Праз Дзяржторгбел было закуплена 1.000 нямецкіх барон. Гэтыя бароны цалкам распрададзены ў Віцебскай акрузе, ад якой быў асабліва вялікі попыт на бароны.

Моцны попыт на шынавае жалеза зьменшыўся, дзякуючы завозу гэтага жалеза з маскоўскіх складаў. На 20 красавіка сельска-гаспадарчая каапэрацыя завезла 14 тыс. пудоў шыннага жалеза. Чакаецца завоз яшчэ 10 тыс. пуд. гэтага жалеза З прычыны адсутнасьці жалеза, Мэталасындыкат спыніў дастаўку яго.

Попыт на дробны інвэнтар (восі жалезныя, вілы, садовы і пчалярскі інвэнтар) здаволен цалкам.

Таксама цалкам здаволен попыт на насеньне. Жыхарству прададзена каля 20.000 пуд. вікі, 13.000 пуд. лубіну і 2.500 пуд. серадэлі. Горшае становішча з канюшынаю. Усе запасы яе ў колькасьці 6.000 пуд. прададзены. Асабліва вялікі попыт на канюшыну ў Віцебскай, Полацкай і Аршанскай акругах.

Па акругах разьмяркован увесь суперфасфат у колькасьці 70 000 пудоў, які атрымаў Белсельсаюз. З атрыманых 40 000 пудоў тамасшлаку, да восені засталіся нераспрададзенымі 30.000 пудоў.

Плян Наркамзему ў галіне здаваньня машынамі выканан на ўсе 100 проц. Спружынавымі баронамі і дробным інвэнтаром жыхарства здаволена больш, як на 100 проц.

Што датычыць насеньня, дык Белсельсаюз выканаў заданьне Наркамзему, згодна яго апошняга пляну, у адносінах канюшыны на 80 проц., а ў адносінах іншага насеньня—на ўсе 100 проц.

Значна горшае становішча са здаваньнем сялян мэталамі, бо Мэталасындыкат і іншыя трэсты зя выканалі ўгавор на 75 проц. Заданьне выконвалася, галоўным чынам, за кошт ўвознага жалеза.

Асабліва пасьпяхова ішло здаваньне сялян малочным інвэнтаром, што вельмі важна ў справе разьвіцьця малочнае каапэрацыі Беларусі. Плян выканан цалкам. Прададзена інвэнтару на 250.000 руб.

Зараз Белсельсаюз рыхтуецца да асеньняе пасяўнсе кампаніі. Ужо закуплена 500 веялак. Разам з тым, што ёсьць на складах, Белсельсаюз увосень будзе мець каля 2000 веялак. Загатаўляецца 1500 штук малатарань.

Белсельсаюз купіў у Сібіры партыю коняў у 56 галоў. Усе коні адпраўлены ў Віцебскую акругу.

Л.

У прэзыдыуме Менскага АВК.

Адчыненьне памяшканьня для дзяцей бяспрытульных матак.

Прэзыдыум АВК пастанавіў адчыніць памяшканьне для дзяцей бяспрытульных матак. На гэту мэту будуць выкарыстаны 1.325 р. з сум, асыгнаваных на барацьбу з жабрацтвам і прастытуцыяй.

Падрыхтоўка да сьвята 1-га мая

На падрыхтоўку да сьвяткаваньня 1-га мая і ўбраньне гораду, прэзыдыум АВК асыгнаваў для сваіх падшэфных часьцей 800 руб. з запаснога фонду АВК.

Менш валакіты—больш эканоміі.

У штодзённай працы часта даводзіцца сустракаць шмат зьяў, якія выклікаюць непатрэбную валакіту і бескарысную трату дзяржаўных сродкаў.

Відаць, што да ёка ня ўсе яшчэ ведаюць, што „савецкая капейка сацыялістычны рубель беражэ“.

Згодна парадку, які існуе ў нас у бягучы час, каб атрымаць палёгку на ваду, электрычнае сьвятло, на кватэру і г. д., трэба падаваць справку ўстановы або прадпрыемства, дзе працуеш, аб заработку. Гэту справку павінен пацьвердзіць мясцком. Добра, калі ўстанова, або прадпрыемства мае невялікую колькасьць рабочых і служачых. Тады на выдачу справак траціцца ня шмат часу і справак. Зусім іншая справа, калі на ўстанове, або прадпрыемстве ёсьць значны лік рабочых і служачых. Тады прыходзіцца траціць шмат часу і сродкаў на выдачу справак. Тут утрыманьне лішняга працаўніка, выдаткі на паперу і г. д. зьяўляюцца непатрэбнымі накладнымі выдаткамі.

Гэткія-ж зьявы, зразумела, заўважаюцца і ў тых установах, у якія трэба ўносіць плату за тыя ці іншыя камунальныя паслугі. Сабраць усе справкі, выканаць усе неабходныя фармальнасьці з імі—на гэта трэба павласьці шмат працы і патраціць значныя сродкі.

Ёсьць выхад з гэткага становішча і вельмі просты. Вось ён: кожны рабочы і служачы, згодна кодэксу законаў аб працы, павінен мець разрахунковую кніжку, у якой адміністрацыя адзначае заработак, час выплаты і г. д. Гэткая кніжка зьяўляецца зусім аўтарытэтнаю справкаю і можа цалкам здаволіць патрабаваньні зацікаўленых установ.

Гэтым можна дасягнуць таго, што будзе зусім зьнішчана валакіта. Служачым і рабочым ня трэба будзе бегаць безальві разоў у месяц да адміністрацыі па справкі. Адміністрацыя пазбавіцца ад выдачы гэткіх справак і захавае сродкі і служачага, г. зн. зьменшыць накладныя выдаткі. Адпаведныя ўстановы таксама зэканомяць значную суму сродкаў, як пазбавяцца ад працы, якая мае сувязь з дачай палёгкі на падставе справак.

А разрахунковыя кніжкі павінны мець усе, шмат хто мае, але, на жаль, зараз у нас ёсьць непатрэбны паралелізм.

Калі будзе зьнішчана гэта валакіта, не адзін савецкі рубель будзе захован.

І Е.

ХРОНІКА.

У НАРКАМЗЕМЕ.

Лесаўпарадкаваньне

Наркамзем намеціў правесьці лесаўпарадкаваньне на плошчы 2.148.000. дзес., а лесакультурныя працы—на плошчы 45.000 дзес. Гэта праца па пляну зойме 5 год.

У лясьніцтвах.

У лясьніцтвах намечана ўстанавіць тэлефонную сувязь, а таксама пабудаваць 250 пажарных вышак.

СМАЛАКУРНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР.

Смалакурныя прадпрыемствы

У сучасны момант у БССР ёсьць 110 працуючых смалакурных катлоў. Гэта складае 40 проц. ад агульнае колькасьці катлоў даваеннага часу.

Катлы ў сёлетнім год е дадуць прыблізна 110 тысяч пуд чырвонай тарпатыны 250 000 пуд. смалы і 600.000 п. вугля.

Ужытак смалакураных прадуктаў.

75 проц. вугля, які вырабляецца ў беларускай смалакурнай прамысловасьці, ужываецца ў межах БССР, а 25 проц. вывозіцца на Украіну і часткай у Маскоўскі раён. Таксама ўжываецца і смала. Тарпатыны ў БССР ужываецца зусім мала. 50 проц. яе адпраўляецца на расейскія рынкі і 50 проц.—заграніцу.

Парад фізкультурнікаў 2 га мая.

1. Збор фізкультурнікаў у садзе Прафінтэрн а 12-й гадзіне дню.

Зьбіраюцца прафсаюзныя, клюбныя і школьныя гурткі пад кіраўніцтвам інструктароў.

2 З саду дэманстрацыя ідзе па вялікай алеі на Пралетарскую вул, далей па Савецкай да рогу Энгельса, па вул. Энгельса на Пляц Волі. З Пляцу Волі па Ленінскай вул. ідуць да рогу вул. Карла Маркса, затым па вул К Маркса да Каломенскай. Адтуль—на Савецкую да чыгуначнага мосту.

Ад чыгуначнага мосту—назад па Савецкай да саду.

Мануфактура для Белкаапсаюзу.

Праўленьне Белкаапсаюзу пастанавіла зрабіць умову з Дубровенскай мануфактурнай фабрыкай на забор тавараў з 1-га красавіка сёлетняга году да 1 га красавіка 1927 г.

Згодна ўмовы Белкаапсаюз атрымае кожны месяц на 75.000 руб. мануфактуры. З 1-га кастрычніка Белкаапсаюз можа павялічыць забор да 100 000 р.

Камітэт дапамогі зьняволеным.

Арганізацыйная камісія пры НК Унутрспраў пастанавіла арганізаваць на абшары БССР усебеларускі і акруговыя камітэты дапамогі зьняволеным і тым, якія звальняюцца з-пад зьняволеньня.

Камітэты, згодна з працаванага палажэньня, будуць арганізоўваць усякую дапамогу праз аб'яднаньне дзяржаўных, прафэсыянальных, каапэрацыйных і палітычных установ і асоб, якія жадаюць змагацца з матэрыяльнымі недахватамі, што часта прыводзяць да паўторнага праступленьня.

Сплаў лесу.

Сплаў лесу ў БССР пачаўся з 5-га красавіка. Галоўныя шляхі па якіх сплаўляецца беларускі лес—рэкі: Днепр, Пціч Бярэзіна Прыпяць са ўсімі іхнымі прытокамі. 85 проц. усяго лесу, які прызначан да сплаву, застаецца ў межах БССР для падтрыманьня фанэрных і іншых заводаў. Дровы амаль што цалком ужываюцца ў межах БССР. Толькі 15 проц. усіх лесаматэрыялаў сплаўляецца на Украіну і РСФСР.

У сёлетнім годзе сплаў у параўнаньні з леташнім годам павялічыўся на 100 проц. Гэта вынікла па тэй прычыне, што і праграмы трэстаў павялічыліся ўдвойчы. Рабочая сіла ўздаражэла дзеля таго, што сплаў значна павялічыўся, і прыйшлося выкарыстаць усе свабодныя рабочыя сілы акругі, адчуваецца нават недахват рабочае сілы. Сярэд. заработак рабочага ў дзень даходзіць да 1 р. 40 к.—1 р. 60 к., павялічыўшыся ў параўнаньні з леташнім годам на 20 проц.

Агульны стан дае падставу думаць, што сплаў у сёлетнім годзе пройдзе добра.

Плата за навучаньне ў вышэйшых навучальных установах.

Прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з прапановай НКАсьветы аб увядзеньні за навучаньне ў вышэйшых навучальных установах новай ступені платы:

Студэнты ці бацькі студэнтаў, якія атрымліваюць пэнсію ад 45 да 60 р., будуць плаціць у год 18 руб., ад 61 да 80 25 руб., ад 81 да 100 35 руб., ад 101 да 120—45 р., ад 121 да 150—60 руб і ад 151 да 200—90 руб.

У дзіцячых садох і ачагох.

З прычыны таго, што ў дзіцячых садох і ачагох знаходзяцца дзеці пераважна працаўнікоў з прадпрыемстваў або ўстаноў, а таксама беднацкіх сялян, Нар. К м. Асьветы пастанавіў ніякага перапынку ў працы гэтых установ не рабіць у працягу ўсяго лета.

На час адпачынку ва[illegible] працаўнікоў яны будуць заменены практыкантамі з пэдтэхнікумаў.

2 АЯ МЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ
СТРАХАВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ
АДЧЫНЯЕЦЦА
4 га мая 1926 году а 6 й гадзіне вечара.
Мандаты дэлегатам выдаюцца да 30-га красавіка штодзённа да 6 гадз. веч.
у памяшканьні Страхкасы.
Усе калектывы, не падаўшыя пратаколаў агульных сходаў па справаздачы Страхкассы, павінны падаць іх не пазьней 30 красавіка г. г.
Менская акруговая страхавая каса.

ГАРАДЗКАЯ ВЫБАРЧАЯ [КАМІСІ]Я
просіць новаабраных у гарадзкі савет дэпутатаў і кандыдатаў зьявіцца па
ЧАСОВЫЯ СЯБРОЎСКІЯ БІЛЕТЫ.
— ВЫДАЧА БІЛЕТАЎ БУДЗЕ РАБІЦЦА —
з 28 красавіка г. г. у канцылярыі Гарадзкога Савету
(Пляц Волі, № 4 1 пад'езд 2 паверх пакой № 4)
штодзённа ад 9 гадзін раніцы да 3 гадзін дню
і ад 7 да 8 гадзін вечара.
Старшыня камісіі РАБІНОВІЧ.

Пастановы і загады ўраду БССР

ПАСТАНОВА
ЦВК і СНК БССР

пра зацьверджаньне правіл аб выдачы даведак копій і аўтэнтычных дакумэнтаў з Цэнтральнага Дзяржаўнага Архіву БССР і яго акруговых аддзелаў.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зацьвердзіць далучаныя да гэтае пастановы правілы аб выдачы даведак, копій і аўтэнтычных дакумэнтаў з Цэнтральнага Дзяржаўнага Архіву БССР і яго акруговых аддзелаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР Я. АДАМОВІЧ

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР З. ЧАРНУШЭВІЧ.

10 красавіка 1926 г.
г. Менск.

ПРАВІЛЫ

аб выдачы даведак, копій і аўтэнтычных дакумэнтаў з цэнтральнага дзяржаўнага архіву БССР і яго акруговых аддзелаў.

1. Копіі, выпісы і даведкі з матар'ялаў, якія захоўваюцца ў архіўных захаваньнях цэнтральнага архіву БССР і ў яго акруговых аддзелах, выдаюцца па пісаных заявах дзяржаўных устаноў, вучоных таварыстваў, грамадзкіх арганізацый і прыватных асоб з захаваньнем статуту аб гэрбавым зборы.

2. Дакумэнты, што выдаюцца прыватным асобам, падзяляюцца на дзьве катэгорыі: а) маемаснага і б) немаемаснага характару.

Увага 1. Даведкі і выпісы з архіваў вайсковае сэкцыі, судовых і натарыяльных устаноў, дыплёматычных дакумэнтаў могуць выдавацца толькі па згодзе з адпаведнымі ўстановамі.

Увага 2. Не выдаюцца прыватным асобам ніякія даведкі аб належнасьці іх да шляхоцкага стану, калі гэта не патрабуецца савецкімі ўстановамі.

3. Дакумэнты немаемаснага характару а таксама копіі даведкі і выпісы з іх выдаюцца загадам архіўнае ўстановы беспасрэдна толькі ўласьніку гэтых дакумэнтаў, або асобам, якія маюць на гэта даручэньне.

4. Дакумэнты маемаснага характару, якія адносяцца да часу да 7-XI (25-X) 1917 г., а таксама копіі даведкі і выпісы з іх выдаюцца ва ўсіх выпадках на падставе пасьведчаньня або адносіна ўстановы, куды яны павінны быць пададзены.

5. Дакумэнты немаемаснага характару, якія адносяцца да часу пасьля 7-XI (25-X) 1917 г., а таксама копіі, даведкі і выпісы з іх выдаюцца заяўнікам беспасрэдна па загаду архіўнай установы пры ўмове, калі памянёныя дакумэнты былі пададзены да справы самім заяўнікам. У другіх выпадках яны выдаюцца толькі на падставе пасьведчаньня або адносьніка ўстановы, якой той ці іншы дакумэнт патрэбен.

6. Атрыманая заява дзяржаўнай установы, прыватнай асобы і інш. аб выдачы дакумэнта, або копій, а таксама і дакумэнт, я і выдаецца, павінны быць праз агульнай рэгістрацыі, занесен у асобную кнігу, дзе запісваецца: 1) чарговы №, 2) каму выдаецца, 3) што выдаецца, 4) на падставе чаго выдаецца, 5) з якога фонду і № справы, 6) калі выдадзена і 7) увага.

7. Копіі і выпісы, якія выдаюцца архіўнымі ўстановамі па сваім тэксьце і арфографіі павінны быць згодны з арыгіналам. У тых выпадках, калі тое, ці іншае месца ў арыгінале ня можа быць прачытана па нячытэльнасьці напісанага, або з прычыны папсутасьці дакумэнта, а таксама калі пры складаньні копій, выпісаў або даведак з обленых папер ўжо аб гэтым у канцы тэксту перад подпісамі службовых асоб архіўнай установы павінны быць зроблены адпаведныя агаворкі.

8. Усе копіі, выпісы і даведкі выдаюцца з цэнтральнага архіву і з яго акруговых аддзелаў за подпісам загадчыка архіву або яго намесьніка, а таксама тых супрацоўнікаў архіўнай установы, якія фактычна рабілі праверку іх з арыгіналам.

9. На ўсіх копіях, выпісах і даведках, якія выдаюцца, павінны быць адзначаны час выдачы іх, № журналу адсыланых папер, назва і шыфр фонду, дзе знаходзіцца дакумэнт. У копіях, выпісах і даведках, якія выдаюцца прыватным асобам, адзначаецца таксама, дзеля чаго яны выдаюцца.

10. Архіўныя матар'ялы павінны безадклад на выдавацца дзяржаўным органам ва ўсіх тых выпадках, калі адпаведным законам прадугледжана права гэтых органаў патрабаваць выдачы ім спраў і дакумэнтаў (арт. 75 Палажэньня аб судабудаўніцтве БССР; арт. арт. 57, 176 і 254 Крымінальна-Працэсуальнага Кодэксу, Палажэньне аб АДПУ і інш.). Дзяржаўны орган паведамляе аб атрыманьні архіўнага матар'ялу архіўную ўстанову, якая выдала гэты матар'ял.

11. У іншых, апрача зазначаных у папярэднім артыкуле, выпадках, архіўныя матар'ялы могуць быць пададзены або высланы дзяржаўнай установе ў часовае карыстаньне, пры безумоўнай у іх патрэбе толькі з папярэдняга дазволу Управы Цэнтральнага Архіву БССР. Тэрмін карыстаньня матар'яламі ўстанаўляецца архіўнай установай у залежнасьці ад тых мэтаў, дзеля якіх яны патрабуюцца, а таксама ад характару і ад становішча гэтых матар'ялаў.

12. Пры выдачы з архіўнай установы дзяржаўнаму органу значнага ліку пасобных матар'ялаў, на іх складаецца опіс у 2 экз., з якіх адзін пакідаецца ў архіўнай установе, а другі адсылаецца разам з матар'яламі дзяржаўнаму органу, які абавязан безадкладна паведаміць архіўную ўстанову аб атрыманьні паказаных у опісе матар'ялаў.

13. Усе копіі, выпісы і даведкі, выдадзеныя з архіўнай установы з захаваньнем гэтых правіл, маюць сілу аўтэнтычных дакумэнтаў, за выключэньнем выпадкаў, прадугледжаных законам.

Старшыня ЦВК БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня СНК БССР. **Яз. Адамовіч.**

Сакратар ЦВК БССР **З. Чарнушэвіч.**

10 красавіка 1926 г.
г. Менск.

Інструкцыя

Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР і Народнага Камісарыяту Працы БССР

аб парадку перарэгістрацыі працоўных кааперацыйных т-ваў (арцеляў).

(Выдадзена на падставе арт. 20 пастановы ЦВК і СНК БССР ад 6-га лістапада 1925 г. „Аб працоўных арцелях", Збор Узакан. ад 28-га сьнежня 1925 г. № 44, стр. 356).

1. Пры перарэгістрацыі працоўных каапэрацыйных таварыстваў, якія ўзьніклі на падставе дэкрэту УЦВК і СНК ад 9-га мая 1923 г. „аб працоўных каапэрацыйных таварыствах" (Збор Узак. 1923 г. № 41 ст. 449) да выданьня пастановы ЦВК і СНК БССР ад 6-га лістапада 1925 г.—таварыствамі, абавязанымі перайсьці на статут працоўных арцеляў, павінны перайсьці толькі такія аб'яднаньні асоб, якія ставяць сваёю мэтаю супольную аддачу ў наём сваёй фізычнай, або разумовай працы і якім толькі ў парадку выключэньня дазваляецца выконваць заданьні працадаўцаў падрадным спосабам з сваіх матар'ялаў, коштам ня больш 5.000 руб. Аб'яднаньні ж, якія маюць уласныя прадпрыёмствы (тэхнічна абсталёваную гаспадарку), або якія ставяць сваёю мэтаю супольную арганізацыю прадпрыёмстваў сяброў таварыства, ва ўсякім разе павінны быць аднесены да прамысловых каапэрацыйных таварыстваў, хоць-бы яны ня мелі вытворчых задач, г. з. выпрацоўкі вырабаў для збыту на рынку, і павінны перарэгістравацца, як гэткія, у парадку дэкрэту УЦВК і СНК ад 7-га ліпеня 1921 г. „аб прамысловай каапэрацыі" (Збор Узак. 1921 г. № 53 ст. 322).

Увага: Наліччa ў арцелі, або ў сяброў яе простых прыладаў вытворчасьці, як сякеры, пілы, рыдлёўкі і г. д., ня можа служыць адзнакаю наліччa асобага тэхнічнага абсталяваньня гаспадаркі (прадпрыёмства).

2. Пры перарэгістрацыі працоўнага каапэрацыйнага таварыства ў якасьці працоўнае арцелі.

Праўленьне таварыства абавязана падаць чатыры экзэмпляры новага статуту, з якіх адзін пасылаецца Рэгістрацыйнай Камісіяй у НК Працы БССР на заключэньне.

Увага: Пры статуце павінна быць прыкладзена заключэньне мясцовага аддзелу працы, або ў раёнах—упаўнаважанага аддзелу працы або сябра райвыканкому, які загадвае працоўным сталом.

3. Пасьля атрыманьня заключэньня НК Працы БССР, Рэгістрацыйная Камісія з удзелам прадстаўніка НК Працы БССР разглядае статут, пры чым у перарэгістрацыі можа быць адмоўлена толькі ў выпадку якоенебудзь неадпаведнасьці статуту законам.

4. Пры перарэгістрацыі працоўнага таварыства ў якасьці прамысловага падача новага статуту неабавязкова. Калі таварыства ня лічыць патрэбным перапрацаваць статут, дык яно можа абмежавацца толькі падачаю заявы аб перарэгістрацыі.

5. У выпадку, прадбачаным у арт. 4 гэтае інструкцыі, статут не пасылаецца ў НК Працы на заключэньне, але пытаньне аб тым ці запраўды арцель павінна быць перарэгістравана, як прамысловае таварыства, а ня ў якасьці працоўнае арцелі, разглядаецца з удзелам прадстаўніка НК Працы БССР. Калі камісія ў паказаным складзе знойдзе, што таварыства павінна быць перарэгістравана, як прамысловае таварыства, дык у далейшым справа разглядаецца без удзелу прадстаўніка НК Працы БССР. У гэтым выпадку ў перарэгістрацыі ня можа быць адмоўлена, але камісія мае права патрабаваць ад таварыства выпраўленьня статуту, калі апошні ў чым небудзь супярэчыць закону.

6. Калі-ж рэгістрацыйная камісія, разглядзіўшы заяву, паказаную ў арт. 4, знойдзе, што таварыства павінна перарэгістравацца, як працоўная арцель, дык яна накіроўвае статут на заключэньне ў НК Працы БССР, і ў выпадку згоды апошняга з поглядам Рэгістрацыйнае Камісіі, перарэгістрацыя павінна быць зроблена ў парадку арт. арт. 2 і 3 гэтае інструкцыі.

7. У выпадку разыхадзіцца між НК Працы БССР і Рэгістрацыйнай Камісіяй па пытаньнях прадбачаных арт. арт. 5 і 6 гэтае інструкцыі, справа перадаецца ў Эканамічную Нараду у БССР у парадку арт. 12 пастановы ЦВК і СНК БССР ад 6-га лістапада 1925 г.

8. Пастановы Рэгістрацыйнае Камісіі могуць быць абскарджаны ўчрадзіцелямі ў выпадках, якія прадбачаны ў арт. арт. 2, 3, 5 і 6 гэтае інструкцыі ў Эканамічную Нараду БССР.

9. Прамысловыя вытворчыя таварыствы, якія ставяць сваёю мэтаю збыт сваёй прадукцыі, а не аддачу ў наём свае працы, зарэгістраваныя ў парадку дэкрэта УЦВК і СНК ад 7-га ліпеня 1921 г. „аб прамысловай каапэрацыі", перарэгістрацыі не падлягаюць. Працоўныя таварыствы якія памылкова былі зарэгістраваны, як вытворча-прамысловыя (прыкл., з прычыны таго, што ўзору статуту працоўнага таварыства выдадзена ня было), павінны быць перарэгістраваны ў парадку, устаноўленым гэтай інструкцыяй.

10. Усе працоўныя таварыствы, якія перарэгістраваны, як працоўныя арцелі, павінны быць выключаны з рэестру прамысловых таварыстваў і перанесены ў спэцыяльны рэестр Працоўныя-ж таварыствы, якія будуць перарэгістраваны як прамысловыя павінны быць пакінуты ў рэестры пад сваім ранейшым нумарам з адзнакаю аб часе іх перарэгістрацыі.

Увага: Узоры статуту працоўных арцеляў можна атрымаць у ВСНГБ.

Старшыня Выш. Сав. Нар. Гасп. БССР—КАЛНІН.

Народны Камісар Працы БССР—ЕРАФЕЕУ.

Узгоднена з ЦСПСБ.

Апавяшчэньні.

У пятніцу 30 красавіка а 9-й гадзіне ўвечары ў клюбе Карла Маркса склікаецца сход актыву Менскай арганізацыі куды запрашаюцца: сябры бюро ячэек, сябры Акружкомаў Райкомаў. ЦК ЦКК. АКК КПБ сябры ЦК і АК камсамолу сябры фракцыі ЦСПСБ ЦП саюзаў і вучпрафсожаў фракцыі ЦВК, СНК Акрвыкаму Ваенкомы і начальнікі палітаддзелаў дывізій, корпусу, а таксама кіраўнікі цэнтральных і акруговых устаноў камуністы.

ПАРАДАК ДНЮ:

Даклад сэкратара ЦК УсеКП(б) тав. Касіёра.

Менскі Акружком КПБ.

— 2 га мая а 12 гадзіне дню адбудзецца ўрачыстае адчыненьне Музэю Рэвалюцыі.

Перад адчыненьнем у двары музэю ладзіцца вялікі мітынг з выступленьнем адказных працаўнікоў. Пасьля мітынгу адбудзецца адчыненьне музэю.

Білеты рассылаюцца Гістпартам.

30 га красавіка, а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Асьветы адбудзецца сход усіх сяброў саюзу працасьветы гор. Менску, прысьвечаны дню 1-га мая. Пасьля сходу, а 10-й гадзіне пачнецца факельная працэсія.

— 1-V, а 10 гадзіне раніцы ўсім сябром саюзу зьявіцца да Дому Асьветы, каб узяць удзел у агульнай дэманстрацыі.

Кіраўнік справамі саюзу працасьветы.

У Доме Працаўнікоў Асьветы.

Парадак правядзеньня майскіх сьвяткаваньняў.

30 IV—Вечар, прысьвечаны сьвяткаваньню 1 мая. Пачатак а 7 гадзіне ўвечары,

1-V—Кіно.

2-V—Канцэрт пры ўдзеле Селяха, Несьцярэнкі, Жыва, Бяссмертнага і інш. Пачатак а 8 з пал. г. увеч.

3-V—Вечар-канцэрт пры ўдзеле жывой газэты Дому. Пачатак а 8 з пал гадз. увечары.

Білеты выдаюцца клюбным упаўнаважаным.

— 30 красавіка а 6 гадз. увеч. у памяшканьні ЦБ Маладняка адбудзецца чарговы зачынены сход Менскай філіі Маладняка.

Яўка ўсіх сяброў і кандыдатаў абавязкова.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

Народны Камісарыят Унутранага Гандлю БССР

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ,

што 20 га красавіка 1926 г. ён запісаў у рэестр па рэгістрацыі трэстаў

Віцебскую дзяржаўную махорачную фабрыку пад назваю „ЗМЫЧКА".

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР зацьвердзіла статут вышэйпамянёнага трэсту пастановаю ад 29 сакавіка 1926 году.

Месца знаходжаньне ўправы: г. ВІЦЕБСК, вул. ЖАРЭСА, № 5.

Прадмет прадпрыёмства:

ВЫРАБ КУРЫЦЕЛЬНАЕ І НЮХАЦЕЛЬНАЕ МАХОРКІ,

Ніжэй абвяшчаецца ўступны баланс трэсту на 1 кастрычніка 1924 г.

Кіраўнік Спраў Народнага Камісарыяту Унутранага Гандлю—НЕСЬЦЕРАЎ.

УСТУПНЫ БАЛЯНС

Віцебскае дзяржаўнае махорачнае фабрыкі

АКТЫЎ. **на 1 кастрычніка 1924 г.** **ПАСЫЎ.**

Актыў	Сума	Пасыў	Сума
Маемасьць	Р. 157 936 57 к.	Капіталы: асноўны	Р. 157.936 57 к.
Матар'ялы	» 81.437 63 »	„ зваротны	» 146.593 13 »
Паўфабрыкаты	» 6 959 86 »	„ рэзэрвны	» 5.993 36 »
Гатовыя вырабы	» 18 034 65 »	„ амартызацыйны	» 9.198 28 »
Каса і бягучыя рахункі	» 1.935 96 »	Фонд для паляпшэньня быту рабочых	» 5.485 — »
Каштоўныя і проц. пап. разам з куп.	» 672 50 »	Банкі па вучоту вэксаляў	» 28 487 52 »
Паі	» 28.050 — »	Вэксалі выдадзеныя	» 1.010 — »
Пададчотныя сумы	» 192 77 »	Рабочыя і служачыя	» 2.765 10 »
Дэбіторы	» 64 561 70 »	Падаткі і зборы	» 29.640 04 »
Вэксалі ў партфэлі	» 4 000 — »	Іншыя крэдыторы	» 21.919 55 »
„ ў вучоце	» 28 487 52 »	Прыбытак (рэшта неразьм. за 1922-24 г.)	» 10.000 — »
„ на інкасо	» 2 650 — »		
„ пратэставаныя	» 504 26 »		
Няскончаныя апарацыі	» 15.223 48 »		
Выдаткі будучага справазд. часу	» 8 882 15 »		
Баланс	Р. 419 028 55 »	Баланс	Р. 419.028 55 »

Дырэктар фабрыкі **МАЗЬЯ.** Галоўны бухгальтар **ШУСТЭР.**

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ УНУТРАНАГА ГАНДЛЮ БЕЛАРУСКАЙ ССР

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ,

што 20-га красавіка 1926 году ён запісаў у рэестр па рэгістрацыі трэстаў фабрыку запалак, якая знаходзіцца пад загадам ВСНГБ, пад назваю

„ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА"

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастановаю ад 29 сакавіка 1926 г. зацьвердзіла статут вышэйпамянёнага трэсту.

МЕСЦАЗНАХОДЖАНЬНЕ ЎПРАВЫ ПАСЁЛАК НОВАБАРЫСАЎ, БАРЫСАЎСКАЕ АКРУГІ.

ПРАДМЕТ ПРАДПРЫЁМСТВА:

выраб запалак фанэрных сядзеньняў і ватэрпасаў.

Ніжэй абвяшчаецца ўступны баланс трэсту «Чырвоная Бярэзіна» на 1 кастрычніка 1924 году.

Кіраўнік Спраў Народнага Камісарыяту Унутранага Гандлю БССР НЕСЬЦЕРАЎ.

УСТУПНЫ БАЛЯНС

на 1 кастрычніка 1924 году дзяржаўнае фабрыкі запалак „Чырвоная Бярэзіна"

АКТЫЎ **ПАСЫЎ**

	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА. Частковая	СУМА. Агульная
1	Маемасьць		243.776—76
2	Матар'ялы		142.998—47
3	Гатовыя вырабы і тавары		27.753—32
4	Грашовыя сродкі і каштоўныя паперы		66 641—84
5	Пададчотныя сумы		321—85
6	Дэбіторы		237.374—08
7	Абавязацельствы і дакуманты да атрыманьня		216 005—12
8	Няскончаныя апэрацыі		10.748—82
9	Няскончаная пабудова		2.512—09
10	Выдаткі будучага справаздачнага часу		2 002—50
	БАЛЯНС		950.134—85

НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА. Частковая	СУМА. Агульная
I. Капіталы:		
Па статуту а) асноўны	243.776—76	
Па статуту б) зваротны	127 223—24	371.000
Рэзэрвны	27 510—42	
Амартызацыйны	15.255—26	
Фонд для паляпшэньня быту рабочых	13 753—96	
» няліквід. каштоўн.	7 461—23	
» пакрыцьця няпэўных даўгоў	19 906—76	83.887—63
II. Пазыкі і вэксалі		162.713—13
III. Вэксалі выдадзеныя		86.275—56
IV. Крэдыторы		246.258—53
БАЛЯНС		950.134—85

Дырэктар—ДВАРЭЦКІ.

Галоўны бухгальтар—ШАПІРА.

АББЕСТКІ прымаюцца ў канторы газэты

„Савецкая Беларусь“

Менск, Савецкая 63, тэлефон 244.

ТЭАТР-КІНО

Бел. Дзярж. ТЭАТР.	**Пятніца, 30 красавіка.** **„УЛІПНЁВУЮ НОЧ“.** Драма ў 3 дз. ГАРЧЫНСКАГА. **Пастаноўка А. МІРОВІЧА.** **Пачатак а 8 з палов. гадз.**
Кіно „Красная Звезда“	**Грандыёзная амэрыканская пастаноўка з удзелам самае папулярнае кіно артысткі МЭРЫ ПІКФОРД.** **„Роман рыбачкі“** (Свет во тьме) **Мастацкая драма ў 8 частках.**
Кіно „Пролетарий“	**Кароль трукаў ГАРЫ ПІЛЬ у карціне** **„Быстрее смерти“** у 7 часьц.

Абавязковая пастанова № 20

Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту.

27 красавіка 1926 г.

У зьвязку са сьвяткаваньнем 1 мая, Акруговы Выканаўчы Камітэт **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Усім дзяржаўным, каапэрацыйным, грамадзкім установам, арганізацыям і прадпрыёмствам г. Менску і на тэрыторыі акругі ўбраць к першамайскаму сьвяту займаемыя імі і знаходзячыяся ў іх веданьні будынкі в такім разрахункам, каб убраньне было скончана да вечара 30 красавіка.

2. Усім дамакіраўніцтвам і дамаўласьнікам Менску і паселішчаў гарадзкога тыпу к шостай гадзіне вечара 30 красавіка і на ўсе дні 1, 2 і 3 мая вывесіць сьцягі.

3. Увесь гандаль, у тым ліку кафэ-рэстарацыі, сталоўкі, піўныя і г. д., у горадзе Менску і на тэрыторыі акругі, дзяржаўны, каапэрацыйны і прыватны спыніць в 6-й гадзіны вечара 30 красавіка і на ўсе дні 1 і 2 мая.

УВАГА: 2 мая першая і шостая рабочыя сталоўкі МЦРК, а таксама сталоўка № 2 МІКА могуць быць адчынены, але бяз продажу сьпірытусовых напіткаў, віна і піва.

4. Працу ва ўсіх установах, на прадпрыёмствах, за выключэньнем тых, якія ня могуць быць спыненымі, а таксама ў майстэрнях і цырульнях—спыніць не пазьней 6-ай гадзіны вечара 30 красавіка і на ўсе дні 1, 2 і 3 мая.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ускладаецца на міліцыю.

6. Вінаватыя ў невыкананьні гэтай пастановы будуць прыцягвацца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 рублёў.

Старшыня ЯЦКЕВІЧ.

Сэкратар СУШКО.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ УНУТРАНАГА ГАНДЛЮ БЕЛАРУСКАЙ ССР

ГЭТЫМ АПАВЯШЧАЕ,

што 20 га красавіка 1926 году ён запісаў у рэестар па рэгістрацыі трэстаў

КРАВЕЦКУЮ ФАБРЫКУ пад назваю

„МЕНСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КРАВЕЦКАЯ ФАБРЫКА“

(скарочаная назва „МЕНШВЭЙ“)

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР зацьвердзіла статут вышэйпамянёнага трэсту пастановаю ад 29 сакавіка 1926 г.

МЕСЦА НАХАДЖЭНЬНЯ ЎПРАВЫ: г. Менск, Ленінская вул., д. № 11.

ПРАДМЕТ ПРАДПРЫЁМСТВА:

Выраб ровнае гатовае вопраткі, галаўных убораў, бялізны і ровная скарняжная праца.

Ніжэй абвяшчаецца ўступны баланс трэсту «Меншвэй» на 1-ае кастрычніка 1924 году.

Кіраўнік Спраў Народнага Камісарыяту Ўнутранага Гандлю — НЕСЬЦЕРАЎ.

Баланс Меншвэю

на 1-га кастрычніка 1924 году,

які зацьверджаны прэзыдыумам ВСНГ БССР.

АКТЫЎ. **ПАСЫЎ.**

Назва рахункаў.	Сума. Частковая.	Сума. Агульная.	Назва рахункаў.	Сума. Частковая	Сума. Агульная.
Маемасьць:			Асноўны фонд		14 283—90
Абсталяваньне	—	14.283—90	Зваротны фонд		76.716—10
Матар'ялы:			Амартызацыйны форд		931—83
Асноўныя	30.179—46 (у тым ліку нелік. 8.566)		Фонд на пакрыцьцё няпэўных даўгоў		29.010—83
Дапаможныя	8.696 80		Рэзэрвны капітал		810—58
Розныя	679 11		**Крэдыторы:**		
Апал	504—00	40 059—37	Рабочыя	5 001—37	
Гатовыя вырабы	— —	46.992—61	Служачыя	770—90	
Гатовыя вырабы ў дарозе	— —	33.263—54	Пастаўшчыкі	1.164—42	
Грашовыя сродкі:			Узаемныя разрахункі	20 669—10	
Каса	3.778—05		Розныя асобы	13.223—57	
Бягучыя рахункі	75—33		Пакупшчыкі	872—50	41.701—82
Каштоўныя паперы	147—33	4.000—71	Вэксалі выдадзеныя	—	76.575—45
Пад'адчотныя сумы.		1.989—85	**Банкі па вучоту вэксалёў.**	—	14.092—19
Дэбіторы:			Баланс		254 122—25
Авансы пастаўшчыком	15 669—92				
Пакупшчыкі	15 973—23				
Узаемныя разрахункі	1 456—53				
Розныя дэбіторы	11.967—04	45 066—72			
Няпэўныя дэбіторы		29.010—83			
Вэксалі ў партфэлі		25 225—85			
Вэксалі пратэставаныя		136—68			
Вэксалі ў вучоце		14 042—19			
Баланс		254.122—25			

Па-за балянсам: тавары, якія атрыманыя на камісію—5.119—50, камітэнты—5.119 р. 50 к.

Упраўляючы фабрыкі «Меншвэй» ПЭЙГІН.

Галоўны бухгальтар ГОЛЬДБЭРГ.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ УНУТРАНАГА ГАНДЛЮ БССР

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ,

што 20 га красавіка 1926 году ён запісаў у рэестр па рэгістрацыі трэстаў

дзяржаўны чыгуна-ліцейны завод пад назваю

„ЭНЭРГІЯ“

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР зацьвердзіла статут вышэйпамянёнага трэсту пастановаю ад 29-га сакавіка 1926 году.

МЕСЦАЗНАХОДЖАНЬНЕ ЎПРАВЫ: г. Менск, вул. Лекерта, дом № 40.

ПРАДМЕТ ПРАДПРЫЁМСТВА:

выраб машынабудаўніцтва, чыгуннае ліцьцё, рамонт мэханічнае працы.

Ніжэй абвяшчаецца ўступны баланс „Энэргія“ на 1 кастрычніка 1924 году.

Кіраўнік спраў Народнага Камісарыяту Ўнутранага Гандлю БССР—НЕСЬЦЕРАЎ.

БАЛЯНС на 1-е кастрычніка 1924 г.

чыгуналіцейнага і машынабудаўнічага заводу „ЭНЭРГІЯ“.

АКТЫЎ. **ПАСЫЎ.**

I. Маемасьць:			**I. Капіталы:**		
Будынкі вытворчага значэньня	45.924—77		асноўны	94 660—32	
Тэхнічнае абсталяваньне і машыны	44 541—64		Па статуту зваротны	66.339—68	161 000 —
Інструманты	1 523—22		Рэзэрвны	4.021—68	
Жывы інвэнтар	425 —		Амартызацыйны	3 738—62	
Мёртвы інвэнтар	2.245—59	94.660—32	Фонд для паляпшэньня быту рабочых	2.975 —	
II. Матар'ялы:			Фонд для пакрыцьця няпэўных даўгоў	83—33	10 818—63
Асноўныя	30.257—72		**II Пазыкі і вэксалі:**		
Дапаможныя	4 419—33		Спэцыяльныя бягучыя рахункі н'тавары	4 178—21	
Розныя	1 933—45		Банкі па вучоту вэксалёў	13.520—38	17.698—59
Інструманты і рэмні, якія ўжываліся менш году	2 914—72		**III. Вэксалі выдадзеныя**		7.875—10
Апал	1 983—48	41.508—70	**IV. Крэдыторы:**		
III. Паўфабрыкаты		9 287—50	Рабочыя	3.536—87	
IV Гатовыя вырабы на складзе		15.876—14	Служачыя	488—32	
V. Грашовыя сродкі і каштоўныя паперы:			Пастаўшчыкі і падрадчыкі	828—66	
Каса	1.019—46		Узаемныя разрахункі з госп. адзінкамі ВСНГБ.	12 589—73	
Бягучыя рахункі	270—43		Узаемныя разрахункі з гандлёвымі арганізацыямі ВСНГБ	11 486—27	
Каштоўныя і процантныя паперы разам з купонамі	1 140 —		Авансы пакупшчыкаў: дзяржаўных спажыўцоў	3.622—82	
Пай	3 500 —	5.929—89	каапэратываў	1.033—89	
VI. Пад'адчотныя сумы		2.646—48	прыватных асоб і ўстаноў	410—90	
VII. Дэбіторы:			Неаплачаныя падаткі і зборы	2.100—23	
Авансы рабочым і служачым	984—35		Розныя крэдыторы	8.933—70	45.031—39
Авансы пастаўшчыкам і падрадчыкам	1 254—64				
Пакупшчыкі: дзяржаўныя спажыўцы	3.261—73				
„ прыватныя асобы і ўстановы	203—77				
Узаемныя разрахункі з гаспадарчымі адзінкамі ВСНГБ	3 086—87				
Разрахункі з гандлёвымі арганізацыямі ВСНГБ	21.172—52				
Авансы ў лік падаходнага падатку	— —				
Разрахункі з упаўнаваж. і агэнцтвамі	3.268—95				
Розныя дэбіторы	5.200—01	33.432—84			
Няпэўныя даўгі		83—33			
VIII. Абавязацельствы і дакументы да атрыманьня:					
Вэксалі ў партфэлі	650 —				
Вэксалі ў вучоце	13.520—38				
Вэксалі пратэставаныя	600 —	14.770—38			
		19.228—13			
IX. Няскончаная вытворчасьць		242.423—71			242.423—71
БАЛЯНС			**БАЛЯНС**		

Упраўляючы заводу (подпіс). **Галоўны бухгальтар** (подпіс).

Галоўлітбел № 17595

ЗГУБЛЕНЫ:

— Спраўка аб нараджэньні сына, выд. Радзільным прытулкам, Жоравай М. С., № 2094.

— Пашп., выд. Варонежскай міліц., Багдановіч М. С., кв. 2095.

— Чырвонаарм. кніж., выд. №-м страл. палкам 2 й Бел дыв., Дану С. А., кв. 2096.

— Сябр. кніж. № 18248, выд. саюз. ж-гуначнікаў, Сасновічу А. Н., кв. 2097.

— Пасьведч. № 250, выд. упр. Зах. чыг. Сасновічу А. Н., кв. 2098.

— Пасьведч. № 258-а, выд. упр. Заходняй чыгункі, Сасновічу В. С., кв. 2099.

— Каапэрац. кніж. МЦРК, сябра сал. прац. камун. гасп., Маровану М. А., кв. 2100.

— Учотн. карт., выд. Менск. акр. ваен. ком, Юхновічу А. А., кв. 2101.

— Кніж. беспрац., выд. Менск. страх. каш., Карліонавай В. І., кв. 2102.

— Сябр. кніж. № 6047, выд. саюз. с-ва служачых гандлю Савельзон Ц. М., кв. 2103.

— Пасьведч. № 10998, выд. Менск. акр. міліц., Бекман М. М., кв. 2104.

— Лічн. кніж. № 10, выд. б. Забалацкім вал. вык. ком., Слуцкай акр., Кустановіч Б. А., кв. 2105.

— Пашп., выд. 39 м райёнам Маскоўскай міліцыі Чэрнік М. Ф., кв. 2088.

— Рэгістрац. карт. на каня № 1496, выд. б. Гайна-Слабадзкім вал. вык. ком. Гатоўту А. В., кв. 2089.

— Каапэрац. кніж № 11462, сябра саюзу кажэўнікаў, Фрыдману М. В., кв. 2090.

— Дублікат лічн. кніж. № 1088, выд. Менск. акр. ваен. ком., Дзітмарову В. В., кв. 2091.

— Пашп., выд. Менск. акр. міліц., Прылееш Ф. Ю., кв. 2092.

— Лічн. кніж. выд. б. Сёмкава-Гарадзенскім вал. вык. ком., Яраш эвічу І. І., кв. 2093.

— Учотн. кніж. на каня № 418, выд. б. 9-м ваен. конск. вуч., Ярмоў Янка.

— Сябр. кніж. № 1067974, выд. саюз. металістаў, лічн. кніж. № 19, выд. Багатольскім ваен. ком., Нікіфараў Янка.

— Учотн. кніж. на каня № 396, выд. 3-м ваен конск. вуч., Кулік Янка.

— Учотн. кн. № 222, выд. б. Станьк. вал. вык. ком., Івашын Захарь

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1-ая дзяржаўная друкарня.